Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 6 (2648) Год LII Беласток, 11 лютага 2007 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Важнае, каб людзі памяталі

У 23 нумары „Нівы" ад 05.06. 2005 г. пісаў я пра стан занядбаных і забытых могілак у Дубінах. Артыкул адначасова быў вопісам стану могілак, яго выгляду і гістарычных каштоўнасцей, а таксама заклікам да іх упарадкавання. На заклік адгукнуліся нямногія, аднак моладзь не падвяла. Нягледзячы на нешматлікасць удзельнікаў, удалося правесці запланаванае раней генеральнае парадкаванне некраполіі. Работы па вяртанні могілак да ранейшага стану працягваліся роўна месяц. У гэтым часе ўдалося правесці многія працы, а менавіта: высечку разросшыхся на могілках (прыблізна 1,5 гектара) карчоў і кустоў, парадкаванне і ачыстка надмагільных помнікаў, аднаўленне знішчаных і перакуленых крыжоў і надмагілляў, а таксама агульнае парадкаванне. У работах дапамагалі нам зняволеныя, за што дзякую Следчаму арышту ў Гайнаўцы і самім вязням.

Праца на могілках была вельмі цяжкая, патрабавала напружанага фізічнага высілку і ахвоты да бескарыслівага дзеяння. Аднак моладзь выказалася заангажаванасцю ў справу, а таксама здольнасцю да супольнай дзейнасці дзеля ідэі. Нашы дзеянні падтрымалі таксама мясцовыя прадпрымальнікі, уласнікі магазінаў, якія прывозілі нам правіянт і напоі.

У ходзе парадкавання могілак, калі з-пад гушчара кустоў адкрываліся чарговыя крыжы і помнікі, складалася ўражанне, што ствараюць яны суцэльны комплекс разам са шматвяковымі соснамі, якія растуць вакол могілак, і фруктовымі дрэвамі. Апрача таго выразна вызначыліся лініі, якія дзялілі могілкі на сектары, прыналежныя паасобным вёскам. Звычайна членаў сям'і хавалі разам, паблізу сваіх суседзяў. На могілках, апрача жыхароў навакольных вёсак, пакояцца астанкі чужынцаў. Напрыклад, на могілках знаходзіцца нямецкамоўны помнік сям'і — маці з двума дзіцяткамі — ад 1853 г. ці магутных памераў помнік украінцам, якія змагаліся ў 1920 г.

Найстарэйшы захаваны драўляны крыж паходзіць ад 1835 г. і выразаны ён з аднаго кавалка дрэва. Удалося нам таксама паднесці некалькі драўляных і каменных крыжоў. На многіх надмагіллях віднеюць раслінныя дэталі і выявы чэрапа — сімвала смерці чалавека і яго будучага ўваскрэсення (цікавае, што нямногія з іх усміхаліся, чакаючы шчаслівага жыцця пасля смерці).

Чарговым дзеяннем вакол справы могілак было збіранне фатаграфій і дэталёвае апісанне паасобных элементаў некраполіі, а менавіта крыжоў, надмагілляў і дрэў. Усё гэта апісаў я ў сваёй магістэрскай дысертацыі, поўнасцю прысвечанай гэтым старажытным і гістарычным могілкам. Шукаючы матэрыялаў да працы, знайшоў я шмат цікавых звестак пра могілкі, напрыклад, дакументы з інвентарызацыі праведзенай у 1986 годзе Рэгіянальным асяродкам даследаванняў і дакументавання помнікаў даўніны ў Беластоку. Аднак інвентарызацыя была праведзена несумленна і недакладна і таму вырашыў я зрабіць яе нанава. Аказалася, што інвентарызацыя ад 1986 г. не зафіксавала многіх крыжоў і надмагілляў. Вынікала з яе, што на ўсёй прасторы могілак знаходзіцца толькі 26 аб'ектаў, аднак я налічыў і апісаў іх 110. Дадаткова трэба прыняць, што ад дваццацігадовай даўнасці інвентарызацыі шмат драўляных крыжоў упала і сатлела, лежачы на зямлі. Наколькі больш можна было б выратаваць крыжоў! Дастаткова было толькі нанава іх укапаць у зямлю. Аднак на працягу 20 гадоў ніхто не заглядаў на могілкі, хоць у канцы інвентарызацыі ад 1986 г. стаіць прыгожы сказ: „Могілкі абавязкова трэба занесці ў рэестр помнікаў і як найхутчэй абняць парадкава-рэстаўрацыйнымі працамі". А што з гэтага атрымалася? Да сённяшняга дня старыя праваслаўныя могілкі ў Дубінах не дачакаліся занясення ў рэестр, хаця паводле польскіх законаў павінны яны ўжо лічыцца помнікам. Усе могілкі, заснаваныя да 1945 г., павінны атрымаць статус помніка даўніны, а могілкі ў Дубінах нашмат старэйшыя, таму што апошнія пахаванні адбыліся на іх у 1936 г.

Аднак не фармальнасці тут найважнейшыя: ці могілкі гэта помнік ці не? Самае важнае, каб людзі памяталі пра іх, парадкавалі магілы і ўсведамілі сабе важнасць сваёй культурнай спадчыны, з пашанай ставіліся да гэтага месца, даючы могілкам шанц праіснаваць.

Тэкст і фота Паўла ВОШЧАНКІ

Адно вядомае ... ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Кааліцыя аб'яднанай беларускай апазіцыі перажывае хваравіты раскол. Раскол гэты прагназаваўся яшчэ на пачатку стварэння грамадска-палітычнай супольнасці „5 плюс". І не трэба было быць асаблівым разумнікам, каб прадказаць хаду працэсу. Відавочна, што гэтая кааліцыя не грунтавалася на трывалым ідэалагічным падмурку...

Добра нам жывецца ☞ 4

Раіна СТЭФАНЧУК

Самаўраднікаў ваяводства і горада Беластока не прылічыш да бедных. Можна больш сказаць. Большасць з іх можна прылічыць да катэгорыі заможных людзей, раўняючы ўзровень іх жыцця з узроўнем суграмадзян, выбаршчыкаў. Сапраўды, лідэрам тут з'яўляецца член Падляшскай управы, старшыня БГКТ і віцэ-старшыня ўзніклага восенню мінулага года Таварыства беларускай культуры Ян Сычэўскі...

У Цеханоўцы ☞ 5

Міра ЛУКША

— У беларускай хатцы цяпер на стале, на лавах і на падлозе шмат сена, гэта ад Каляд, была і куцця, просвіра — усё рыхтавала адна гаспадыня з Плютыч, — сказаў Антоні Масевіч, старэйшы спецыяліст па этнаграфіі Музея сельскай гаспадаркі ў Цеханоўцы. Музей гэты мае свае беларускія зборы, м.інш. у беларускай хатцы, прывезенай з Сакоў (была яна ўласнасцю дзядоў Міхася Шаховіча). Апрача таго сюды былі прывезены экспанаты з Беларускага музея ў Белавежы...

Успаміны Янкі Крупы ☞ 9

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

(працяг з 5 н-ра)

У Шчэціне прабыў я адзін сезон, больш не мог. Выступаў у аперэтах, м.інш. „Марыца" Кальмана і „Птушкалоў" Цэлера. Я хачу вяртацца ў Беласток, а мяне дырэктар не адпускае. Я ўжо ў Беластоку з Юзвюком дамоўлены, ён мне штат трымае. І каб вырвацца з гэтага капкана я папрасіў сям'ю, каб мне тэлеграму прыслалі, што маці ўмірае. З гардэробшчыцай, украінкай, дамовіўся пакінуць ёй у клуначку тэатральныя рэчы, што ў мяне былі, для здачы...

9 770546 196000

Адно вядомае, іншае — незразумелае

Кааліцыя аб'яднанай беларускай апазіцыі перажывае хваравіты раскол. Раскол гэты прагназаваўся яшчэ на пачатку стварэння грамадска-палітычнай супольнасці „5 плюс". І не трэба было быць асаблівым разумнікам, каб прадказаць хаду працэсу. Відавочна, што гэтая кааліцыя не грунтавалася на трывалым ідэалагічным падмурку. Не так даўно адзіны рух БНФ „Адраджэньне", які ўжо аб'ядноўваў усіх прыхільнікаў дэмакратычных перамен і гуртаваў людзей розных поглядаў на трывалых базавых каштоўнасцях (такіх як незалежнасць беларускай дзяржавы, нацыянальнае адраджэнне), лічыў змену палітычнай улады толькі сродкам дзеля дасягнення галоўных мэтаў. Для цяперашняй жа, нібыта шырэйшай намінальна, кааліцыі ранейшы сродак стаўся самамэтай, за якой, як кажуць, „не бачна лесу".

Параза дэмакратычнай апазіцыі на леташняй кампаніі па выбарах прэзідэнта густа пасеяла зерне расчаравання і песімізму — як сярод выбаршчыкаў, так і ў шэрагах партыйных актывістаў. БНФ, на маю суб'ектыўную думку, моцна прайграў у той кампаніі, у той час як Аляксандр Мілінкевіч не здолеў выйграць, але прыдбаў агульнабеларускую і сусветную вядомасць. Ніхто з фронтаўскіх лідэраў зараз і блізка не мае такой папулярнасці. Галоўная памылка БНФ у тым, што ён, будучы найбольш моцнай і самастойнай апазіцыйнай сілай, пайшоў на хаўрус з камуністамі і іншымі левымі плынямі.

Мінулы тыдзень прынёс два сур'ёзныя зрухі. Па-першае, створаныя ў рэгіянальных кааліцыях камісіі выявілі фальшывыя подпісы (збіраліся яны партыйнымі актывістамі дзеля вылучэння на кангрэс апазіцыйных сілаў). „Вызначыліся" левыя партыі — Партыя камуністаў Беларусі і Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада), старшыня якой Мікола Статкевіч пакуль знаходзіцца ў зняволенні. Збіраць подпісы прадстаўнікі гэтых партыйных арганізацый не захацелі, або не змаглі. У выніку ў большасці рэгіёнаў выбухнулі скандалы. Падробленыя подпісы, непрызнаныя на месцах, цяпер павінны пацвердзіць у цэнтры, дзе створана адмысловая камісія. Да гонару апазіцыі, створаныя ёй з прадстаўнікоў усіх суб'ектаў кааліцыі камісіі па праверцы подпісаў выявілі сумленнасць і прынцыповасць. Дзяржаўныя выбарчыя камісіі маглі б павучыцца!

Што далей, сказаць цяжка. Тым больш, што камуністычная партыя на чале з Сяргеем Калякіным актыўна ўдзельнічае ў стварэнні іншага блока новай кааліцыі разам з сацыял-дэмакратамі Аляксандра Казуліна. І наўрад ці ім ужо будзе такім важным стаўленне „старой" кааліцыі, хоць у вачах міжнародных назіральнікаў ПКБ мусіць страціць шмат.

Па-другое, нядаўні, абраны адзіным лідэрам аб'яднанай кааліцыі экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч наважыўся стварыць яшчэ адну структуру — рух „За свабоду", які вельмі верагодна хутка (канешне, пры жаданні) можа аформіцца ў новую апазіцыйную партыю. Партыя Беларускі народны фронт палічыла падобны крок палітыка, на якога Фронт ставіў у кампаніі па выбарах прэзідэнта, мякка кажучы незразумелым і заявіла пра адмежаванне ад новага руху. БНФ закідвае Мілінкевічу недастатковую актыўнасць і сепаратысцкія памкненні. Шлюбаразводны працэс можа стаць досыць хваравітым для Фронту, бо Мілінкевіч здолеў прывабіць на свой бок значную частку моладзевых актывістаў. А палітычная рада ціха і „элегантна" адхіліла Мілінкевіча ад верхаводства, зацвердзіўшы ратацыйны прынцып кіравання. Такім чынам, усталявалася сітуацыя з адным вядомым і другім незразумелым. Вядома тое, што адзінага лідэра ў аб'яднанай апазіцыі больш няма і гэта ўжо афармлена. Незразумелым застаецца тое, ці зможа існаваць сама аб'яднаная апазіцыя хоць бы ў тым фармаце, у якім яна дзеіла да гэтага часу. А калі зможа, то ці скарэктуе яна свае падставовыя прынцыпы.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вяртаючыеся хвалі

Як асцерагчыся ад вяртаючыхся тэмаў у мастацтве, у прыгожым пісьменстве, у філасофіі? Як гэта ёсць, што творца спрабуе памерацца з імі ў чарговы раз, каб паказаць іх у новым асвятленні, у свежым кантэксце?

Здавалася б, што з праблемамі паходжання мастацтва чытаючая публіка дастаткова ўзнаёмленая, як хоць бы з ніцшанскімі падзеламі на апалонавае мастацтва, назвала б яго анёльскім і дыянісійскае — д'ябальскае. Ці мастацтва нараджаецца з лішку творчай энергіі, ці хутчэй бярэцца з хваробы, з недапасавання да грамадства, з самоты? Ці хвароба творцы, значыць, справа чыста асабістая, дэтэрмінуе ўзнікаючы твор, спавівае яго ў аўру цемры, боязі, песімізму, зла?

Пераглядваючы том лістоў Фрыдрыха Ніцшэ сябрам, вельмі ж нешматлікім яму блізкім людзям, я са здзіўленнем заўважыў, што тыя лісты перапоўнены роспаччу, скаргай на благі лёс; бо якое ж марнае, нэндзнае жыццё вёў гэты хворы, няшчасны чалавек. Як жа гэта не пагаджаецца з геройскім, поўным энергіі і моцным тонам ягоных філасофскіх твораў.

Наш страшны і гожы XX век, які, незалежна ад таго, што аддаляецца з хуткасцю ілюзорна ўзрастаючай, усё ж турбуе нашу постмадэрністычную рэчаіснасць. Мы атрымалі ў спадчыне ад яго схільнасць да ўжывання мастацтва, літаратуры для педагагічных мэт, для выхоўвання грамадстваў асабліва ў духу акрэсленым таталітарнымі ўрадамі, у сістэмах гітлерызму ці сталінізму. Таталітарныя сістэмы выступілі супраць мадэрністычных тэндэнцый, авангарднага мастацтва, падтрымлівалі затое пачцівы, дзевятнаццацівечны рэалізм. Мастацтва і літаратура мелі быць даступнымі шырокім масам, таму абавязвала патрабаванне лёгкасці, прастаты і аптымізму.

Тым часам, калі наша гісторыя чагосьці нас навучыла, дык толькі таго, што няма чаго чакаць простых і лёгкіх вырашэнняў. Прыгадваецца мне, як у рамане Фёдара Дастаеўскага яго героі часта спыняліся перад вісячым на сцяне ў доме Рагожына Распяццем; мабыць, гэта была копія карціны аўтарства заходняга мастака Ганса Гольбейна. Сын Божы на карціне прадстаўлены натуралістычна, як спакутаванае чалавечае цела. У Дастаеўскага знаходзім рэфлексію, што паказ Гасподняй мукі адно як спакутаванага цела можа нараджаць сумненне, бязвер'е, адштурхаць, весці да атэізму. Зусім іначай трактуе святасць тыповая для праваслаўя нерэалістычная ікона, якая не ёсць і не павінна быць копіяй рэчаіснасці, фатаграфіяй натуры. Святы абраз павінен выпраменьваць духоўнасць, дыхаць іншым светам.

Мабыць аўтэнтычнае, вялікае мастацтва і літаратура прабуюць дайсці да канчатковых межаў чалавечай свабоды, даследаваць іх, перакрочыць іх. Хоць вядома, што бунт, пратэст сягаюць яшчэ пачаткаў Рэнесансу, калі гэта скандаліст Франсуа Віён выбраў лёс выклятага паэта, валацугі, лодара. Даў гэтаму сведчанне ў паэме „Вялікі запавет", які змяшчаў пахвалу небяспечнага жыцця, жыцця людзей з абочыны, такіх што не маюць у павазе абавязваючы закон. Можна множыць прыклады, як хоць бы ўспамінаючы творы маркіза дэ Сада поўныя апісанняў сексуальных непрыстойнасцей. У XX стагоддзі Жан Жэнэ, вычварэнец і злачынца ў сваёй скандальнай прозе і драмах ставіў пад пытанне парадак капіталістычнай дзяржавы, буржуазнай маралі. З блізкіх нам ваколіц паходзіў Сяргей Пясецкі, які хоць бы ў „Каханку Вялікай Мядзведзіцы" ўсхваляе ў рамантычнай танацыі быт бравых кантрабандыстаў з-над даўняй польска-савецкай мяжы.

Мабыць, каштоўнасць аўтэнтычнага мастацтва заключаецца на стварэнні новых светаў і за гэта ў цане яго мае інтэлігентны атрымальнік. Патрабаванне, каб мастацтва і літаратура давалі нам маральныя ўрокі, каб прапаведавалі казанні і павучэнні, ну і хай, што слушныя яны і карысныя (а яно з'яўляецца замаскіраваным наказам служэння палітычным элітам), збядняе і выпустошвае мастацкую дзейнасць. Гэта скандал, які абдзірае нас са свабоды.

Бывае, усё ж, гэтак, што людзі патрабуюць перш за ўсё бяспекі і ладу ў зямным сваім побыце, бо свабода становіцца цяжарам, пакутай; а хто ведае, ці тая свабода гэта не навязана зларадными, таемнымі сіламі ідэалістычная выдумка. Мастацкія ўявы здаюцца быць пагрозай, перашкодай у рытме штодзённай мітусні.

Тады вартасцю становіцца цэнзура, для таго, каб закрыць раты непакорлівым, раздражняючым творцам.

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Віцэ-маршалак на мяжы

Віцэ-маршалка Сената, выбранага ў гэтую палату ў Падляшскім ваяводстве ад ПіС, не ўпусцілі ў Беларусь. У палове снежня беларускія пагранічнікі тры гадзіны „сцябалі" падляшскага ваяводу Яна Дабжынскага, які вяртаўся ў Польшчу з аплаткавай сустрэчы ў польскім консульстве ў Гродне. Удзельнічала ў ёй м.інш. Анжаліка Борыс, кіраўнік непрызнаванага рэжымам Аляксандра Лукашэнкі Саюза палякаў Беларусі. Ваявода ў той час сказаў, што шкадуе ён беларускіх пагранічнікаў, якія „мусілі выконваць дзіўныя загады і пратрымліваць яго на мяжы". На яго думку, афіцэры кансультавалі справу яго выпушчэння з асобамі з-па-за памежнай службы.

Віцэ-маршалак Путра таксама хацеў сустрэцца з Анжалікай Борыс. Пасля гадзіны перамоваў з пагранічнікамі і пасля вяртання з мяжы прызнаўся журналістам:

— Мабыць так яно ёсць, што беларускія чыноўнікі ніжэйшага рангу не маглі самі вырашыць справу і мусілі пракансультавацца.

Дадаў прытым, што, мабыць, з-за галантнасці размова з беларускімі чыноўнікамі адбывалася ў вельмі культурнай атмасферы.

Анжаліка Борыс у размове з Інфармацыйным радыёагенцтвам заявіла, што тое, што не ўпусцілі віцэ-маршалка польскага Сената ў Беларусь было мэтанакіраваным і для таго, каб „ускладніць кантакты з палякамі, абвінавачанымі беларускімі ўладамі ў розных злачынствах". Не без значэння ў гэтай „задыме" з'яўляецца факт, што Сенат РП апякуецца польскай меншасцю таксама ў Беларусі.

На гэтае здарэнне адразу адрэагавала МЗС у Варшаве. Пратэст быў перададзены дарадчыку пасольства РБ Уладзіміру Чушаву, а ўчыніў гэта віцэ-дырэктар дэпартамента ўсходняй палітыкі знешнепалітычнага ведамства.

Пытанне: чаму гэта адбылося на такім нізкім узроўні. Адказ чытачы „Нівы" могуць знайсці ў адных з апошніх „Вачэй", у якіх я пісаў аб указаннях міністр Анны Фатыгі, датычных утрымлівання кантактаў польскіх чыноўнікаў з прадстаўнікамі ўлад Беларусі, м.інш. пазбягання спатканняў з паслом Паўлам Латушкам. У гэтым выпадку, у афіцыйным камюніке МЗС, сцверджана, што „прадстаўнік беларускага пасольства забавязаўся скантактавацца са сваімі ўладамі і прадставіць адпаведныя тлумачэнні". Да часу, калі я пішу гэты тэкст, аб гэтых тлумачэннях ні віду, ні слыху. Пры нагодзе другога, далікатна кажучы, памежнага інцыдэнту прыгадаліся мне ізраільскія прынцыпы мытных кантроляў, вызначаныя Эфраімам Кішонам. Мелі яны прымяняцца пры трох катэгорыях чыноўнікаў: нізкага, сярэдняга і высокага рангу. Наконт першай катэгорыі ўказваецца: „Дазволена хуткае абшуканне багажу. Нельга ўкладваць рукі ў кішэні, а тым больш капацца ў бялізне. Багажы кіраўнікоў абшукваць павярхоўна ды ў цёмных акулярах". Наконт другога: „Дазваляецца асцярожна абмацаць чамадан на 8 см углыб, а мытнік мае ў той час глядзець у даль". На канец пры чыноўніках найвышэйшага рангу: „Чамаданы дзяржсакратароў можна адчыняць з заплюшчанымі вачыма на тры секунды. На закрыты багаж можна мімалётна кінуць позірк з адлегласці трох метраў у зацемненым памяшканні. Наступным чынам тры або чатыры разы папрасіць прабачэння". Мяркую па ўказаннях Эфраіма Кішона, што віцэ-маршалак Сената прыналежаў бы да трэцяй катэгорыі. Адно толькі, што віцэ-маршалка Путру беларускія памежнікі не дапусцілі нават да мытнага кантролю.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Крадзеж і пакута

Фота Уладзіслава Завадскага

Пеця Кот напсаваў мне многа крыві. Я і сама тут вінаватая — ідзе пра маю грамадскую дзейнасць у этнааб'яднанні „Ганак". Навошта яна мне патрэбная? Ці не лепш сесці на д... і наракаць як усе.

— *Біда*, — кажа пра сваё быццёжыццё Кот. — З ніякага боку дапамогі пушчанскаму гаспадару сёння няма.

Кот любіць наракаць. Кожную гутарку ён пачынае са слоў: *Калісь было лепш!* Няважна, што тое „калісь" у яго выпадку, гэта час ваеннага становішча. Час, калі ён сам сядзеў у турме. Не, не з-за палітыкі — крый Божа! Па сённяшні дзень з павагай успамінае генерала Ярузельскага.

Сядзеў ён за звычайнае браканьерства:

— Але тады хоць тлустай дзічыны са смакам пажэрлі.

Кот аж аблізаўся на апошні ўспамін.

— А што, зараз яна худая?!

— Паршывая такая, — пра апошняе Пецька кажа з агідай: — Усе зайцы заразныя. І то каб якім грыпам? Венерычнай хваробай хварэюць. Бач, да чаго дажыліся!

Мне хацелася заступіцца за айчынную прыроду, згадаць хоць бы грыбы, якія наздзіў самавіта абрадзілі здаровыя летась.

— І чым гэта ўсё скончыцца? — Кот не дапускае мяне да слова, ён ведае найлепш: — Канец усяму будзе, катастрофа.

* * *

„Катастрофа" найперш звалілася на Ката. Пецька здурэў. Бегаў па вуліцы і крычаў, што тэрарысты з „Аль-Каіды" за ім сочаць. Нібыта на маторах прыязджаюць, каля яго хаты брумкаюць. Шчоўкаюць фотаапаратамі, здымаюць пра яго фільм на тэлекамеру... Пасля за ім прыехала хуткая дапамога.

Праўда, Ката адвезлі назад яшчэ ў той самы дзень:

— Далі конскі ўкол і *довідзэня*, — кпяць у Н.

Цяпер Пецька Кот сядзіць ля тэлевізара і шчоўкае пульцікам. Або ўключае камп'ютэр і глядзіць на ікону са сваім „новым" калодзежам. У нашай гісторыі ён найважнейшы.

Гэты калодзеж — мая пакута. На кантроль калодзежа прыязджаю ўжо другі год, раз у квартал. Спачатку Кот хаваўся, запіраў дзверы перад этнааб'яднаннем „Ганак". Добра, што ў бары „Амазонка" падказалі нам тактыку: *Хай дзяўчына сама да яго пойдзе. Ён не такі ўжо дурны — не пражане кабеткі з панадворка.*

У аб'яднанні толькі адна кабета, таму хоць рад не рад, выпала на мяне.

— Пётр, давайце, дапаможам вам! — паўтараю за кожным разам.

— То распранайся, — чую ў адказ.

У мяне ў кішэні газавы пісталет, у сэрцы многа спагады для кожнага стварэння, таму спакойна вяду перагаворы:

— Прывязем дзерава, самі паставім журавель, замантуем калаўрот, усё будзе згодна з праектам. Дазвольце нам падзейнічаць і вам дапамагчы.

— Вы ж ужо мой калодзеж „змантавалі", — агрызаецца Кот. Такі адказ цешыць мяне апошнім часам. Гэта знак, што наш выканаўца даходзіць да сябе пасля конскага ўколу.

Аб'яднанне „Ганак" у пэўнай ступені спрычынілася да яго хваробы. Гэта мы зрабілі Ката лаўрэатам конкурсу на найпрыгажэйшы калодзеж, далі яму грошы на адбудову. Канкрэтна, на новыя журавель і калаўрот.

— А я як добры дурань згадзіўся, — наракаў пасля лаўрэат праекта ў бары „Амазонка".

Мы сапраўды пераборшчылі справу, замест пачакаць канкрэтнага эфекту, памясцілі ўзнагароджаны калодзеж на інтэрнэтнай старонцы <www.ganakkolodec.pl>. На нашай старонцы калодзеж ужо з жураўлём і калаўротам. Побач стаіць венік на доўгай тычцы і супрацьпажарны басак. Тут жа карыта і дубовая бочка.

У рэальнасці няма нічога. І цяжка сказаць — ці будзе. Студня нядаўна абвалілася. Пасля ўтапілася ў ёй лісіца, таму Кот не п'е ўжо гарбаты, толькі адно піва. Вядома, якой „катастрофай" гэта ўсё кончыцца.

* * *

А яшчэ два гады таму ўсе былі задаволены. Мы цешыліся, што папаўся нам талковы гаспадар.

— А каб вы ведалі як я цешыўся?! — такімі словамі Кот звычайна пачынае свой аповед. Асцерагае іншых перад нашай суполкай. Дзень, калі ён атрымаў грошы на новы калаўрот, запамятала ўся вёска. Наш лаўрэат ставіў піва кожнаму, хто з'явіўся ў бары „Амазонка". Не цяжка дадумацца, што ў гэты дзень і вечар балявала ў Н. навалач з усяго свету, значыць, з суседніх вёсак. Апошнія патрапілі сюды нюхам.

Той дзень запамятаўся і з-за мардабою. Пад поўнач чуць не забілі Мікіту Р. Вясковы вершаплёт-графаман таксама назваў сябе „лаўрэатам" ды стаў чытаць з памяці свае вершы. Рыфмаванкі не спадабаліся кампаніі: *Давай частушкі — а ніэ, то ў гомэль достанеш!* Наколькі Мікіта Р. пляце толькі прыродапісальныя вершыкі, — палілася кроў.

Перад бойкай Кот распавёў усім пра свае планы. Як адновіць свой калодзеж, пасля стадолу і свіран (яны пакуль не ўзнагароджаны). Дзеля нашага праекта Пётр Кот публічна паабяцаў, што купіць у лесніка дуб і хвойку. Дэкларацыя навяла ў кампаніі кпіны і абурэнне:

— Ты мусіць на галаву ўпаў, — зразу скрытыкавалі сябры. — Лес пад бокам, а ён дзерава надумаўся купляць. Ідзі і рубай колькі трэба! Людзі паркеты ўнукам у Беластоку з крадзенага парабілі. А тут такі *ўчцівы* знайшоўся. Ты, брат, ашалеў ад таго выйгрышу! Лепш не гавары такога, людзі пальцамі тыцкаць будуць.

Яшчэ ў той самы дзень застольнікі збіраліся ехаць у лес красці дубок. План не спрацаваў па банальнай прычыне: у адзіным на ўсю вёску трактары не было саляркі.

Шкада. План, хоць дурны і небяспечны, быў найлепшы з магчымых. Вядома — для нашага аб'яднання, у нас найважнейшыя тэрміны (гэта таму мы паставілі на сваёй інтэрнэтнай старонцы віртуальны калодзеж).

* * *

Пецька таксама меў свае „тэрміны". Калі ён гаварыў пра легальную куплю драўніны — думаў пра іншае. Ён не спяшаўся з паездкай да лесніка. Наадварот. Ён сам добра ведаў, які зарад энергіі і шчасця давала яму кража дзерава з лесу.

Гэта быў адзіны рэальны азарт, які прапанавала яму жыццё.

Пошукі дубка пачаліся ўжо ў студзені 2005 года.

— Гэты дубок я проста высніў, — прызнаўся пасля Кот. — Я шукаў яго тры месяцы. Зрубаў яшчэ за марозу, калі дрэва мёртвае і добра сохне.

Да восені дуб праляжаў у лясной скрытцы Ката (там ён хавае нелегальную дзічыну). І калі ў час кантроляў мы напаміналі пра тэрміны, Пецька толькі пасміхаўся:

— Паспеем, усё будзе як трэба!

Па дуб пайшоў ажно ў Піліпаўку, пасля дзевяці месяцаў. На дварэ яшчэ было цёмна. Кот зачапіў бервяно за вайсковы паясок і без спеху валок яго на свой панадворак. Першы лясны адрэзак, семсот метраў, пераадолеў за гадзіну. Пасля апынуўся ў чыстым полі. Пачаўся світанак. Кот асланіў рукой вочы, каб адчытаць па сонцы гадзіну. І замест сонца пабачыў... тое дзіва. Цяпер пачуў гул, шорах. Не чуў болю, калі калода звалілася на нагу. Хацеў уцякаць, але не было як — ногі не слухаліся. Пецька ведаў, што трэба схавацца, але не даў рады. Укапаўся.

— А што вы такое пабачылі? — пытаю. Мне крыўдна і смешна за сябе. Навошта мне слухаць гэтыя дурноты. Кот таксама думае — ці сказаць праўду. Скажа:

— Гэта ляцеў чырвоны *балён*, паветраны шар, значыцца.

Ева СЦЕПАНЮК

Дорага каштуе

Дорага абыходзіцца Амерыцы тая вайна ў Іраку, якую яна ўсчала тры гады таму назад. Дагэтуль загінула ў ёй тры тысячы амерыканскіх салдатаў і штодзённа ёсць чарговыя ахвяры па двух баках; вядома, больш гіне іракцаў, але кулі і выбухі бомб не мінаюць і марынз ды польскага кантынгенту, які дапамагае саюзніку. Вайна гэтая дорага абыходзіцца і ў матэрыяльным сэнсе, але гэта дзеля таго, каб завалодаць іракскім „чорным золатам".

З дапамогай ЗША да ўлады ў Іраку далезлі тамашнія амерыканскія падлізы і гэта яны ганебна расправіліся на шыбеніцы з Садамам Гусейнам і мо думаюць, што вайна спыніцца. Памыляюцца, бо не кожны народ можна паставіць на калені. Ірак нікому не пагражаў, у тым ліку і Польшчы і вялікі аўтарытэт 20-га стагоддзя, папа Іаан Павел II, быў супраць гэтай бруднай вайны, але ніхто яго не паслухаў. І вельмі дзіўна, што палякі, якія быццам яго найбольш шанавалі і любілі, найменш у свеце пратэставалі супраць гэтай бойні, бо ў Варшаве пратэставала толькі жменька людзей, тады калі ў Вашынгтоне ці Лондане супраць вайны ў Іраку выходзілі сотні тысяч дэманстрантаў. Значыць, да палякаў гэты заклік іхняга земляка не дайшоў, але хаця на захадзе больш любяць мір, грамадства ў гэтай справе было бездапаможнае.

Мікалай ПАНФІЛЮК

За кім рацыя?

Нядаўна адна беластоцкая газета пісала, што войт Міхалоўскай гміны задумаў узвесці новы будынак для гміннай адміністрацыі і, на бяду, высек шмат лесу ў Лявоневічах. Супраць гэтаму запратэставаў староста Беластоцкага павета і аштрафаваў войта на два мільёны злотых. Староста кажа, што лес належыць не гміне, а толькі павету. Войт у сваю чаргу даказвае, што ў яго было права высечы лес. У такой сітуацыі паўстае пытанне: да якога павета належыць Міхалоўская гміна — ці не да гэтага, староста якога пратэстуе? А можа падляшскі ваявода аштрафуе старосту, бо ён начальнік над ім?

Войт не высек лесу для сябе, толькі для гміны і ён сваімі грашыма плаціць штраф не будзе. Відаць, войту падстаўляюць нагу, каб ён упаў. У такой сітуацыі гэта суд павінен разабрацца ў справе і вырашыць яе на карысць гміны.

Дзядзька ЗАХАР

Конкурс „Падляшша ў фотааб'ектыве"

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы запрашае да ўдзелу ў III выпуску фатаграфічнага конкурсу пад лозунгам „Падляшша ў фотааб'ектыве".

Да канца сакавіка 2007 года трэба даслаць у музей тры фотаздымкі фармату 20 х 30 см, тэматычна звязаныя з Падляшшам. Падборка тэматыкі — давольная.

Здымкі ацэніць журы і ўсе ўдзельнікі конкурсу атрымаюць падарункі.

(мох)

Добра нам жывецца

Самаўраднікаў ваяводства і горада Беластока не прылічыш да бедных. Можна больш сказаць. Большасць з іх можна прылічыць да катэгорыі заможных людзей, раўняючы ўзровень іх жыцця з узроўнем суграмадзян, выбаршчыкаў. Сапраўды, лідэрам тут з'яўляецца член Падляшскай управы, старшыня БГКТ і віцэ-старшыня ўзніклага восенню мінулага года Таварыства беларускай культуры Ян Сычэўскі.

Пераглянулі мы маёмасныя заявы беларускіх радных, якія засядаюць у Падляшскім сеймику і беластоцкай Гарадской радзе, а таксама намесніка прэзідэнта Беластока Аляксандра Сасны, які прызнаецца да сваёй меншаснай прыналежнасці. Большасць упісаных у заявах даных адносіцца да стану за 2005 год і датуецца чыслом снежня 2005 г. Інфармацыі аб заробках падаваліся ў гадавым маштабе. У рашучай большасці нашы самаўраднікі, апісваючы свой маёмасны стан адзначаюць, што паасобныя кампаненты маёмасці з'яўляюцца маёмаснай сужэнскай супольнасцю.

Сёлета да маёмасных дэкларацый трэба далучыць заявы аб вядзенні на тэрыторыі дадзенага самаўрада гаспадарчай дзейнасці жонкай (ці мужам) і паказаць, ці жонка (муж) не зарабляе ў г.зв. самаўрадавых арганізацыйных адзінках. Тут усе ваяводскія радныя заявілі, што іх гэта *не тычыцца*. Падобна зрабіў віцэ-прэзідэнт Сасна. А цэлая чацвёрка меншасных радных Беластока паказала, што іх жонкі працуюць у гарадскіх школах. Прычым, як даведаліся мы ў бюро Падляшскага сеймика, магчымасць праверкі заяў аб дзейнасці жонак ці мужоў на практыцы нязначная.

Некаторыя з нашых радных — здаецца — на сваю карысць выкарысталі ўказанні змешчаныя ў маёмасных заявах. Не ўсе ва ўсіх пунктах упісвалі вартасць пералічаных багаццяў. Напрыклад, Ян Сычэўскі не падаў вартасці адзінак інвестыцыйных фондаў, якія ў яго валоданні, а іх колькасць пералічваецца аж у тысячах. З нашых калькуляцый вынікае, што ўся вартасць маёмасці, што ва ўладанні Яна Сычэўскага, перасягае мільён злотых. Толькі за грошы, здэкларараваныя ім у пункце „Капіталаўкладанні" можна было б у Беластоку сарганізаваць у два з паловай раза Фестываль беларускай песні, беручы пад увагу апошнюю адкінутую заяву, накіраваную Таварыствам беларускай культуры ў Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. Радны Мікалай Гаўрылюк і віцэ-прэзідэнт Сасна не ўпісалі вартасці аўтамашын. А радны Міхал Карповіч прамаўчаў каштоўнасць некаторых нерухомасцей. Дарэчы, гэты апошні беластоцкі радны запоўніў сваю маёмасную заяву (як іншыя гарадскія радныя) паводле прынцыпу „гуляй душа..." У пункце „Іншыя нерухомасці" накрамзоліў так неміласэрна, быццам не прачытаў раней службовай заўвагі на пачатку фармуляра: „Асоба, якая падае заяву, абавязана згодна з праўдай, старанна і дакладна запоўніць кожную рубрыку". Заявы ваяводскіх радных былі даведзены да публічнага ведама электронным спосабам.

Несумненна, па-за Янам Сычэўскім, да бедных не належыць таксама ваяводскі радны Яраслаў Матвяюк. Вартасць ягонай маёмасці, уключна з заробкамі і адымаючы крэдыты, сягае мільёна злотых. Несумненна, „абшарнікамі" з'яўляюцца засядаючыя на сеймікавых лавах радныя-сяляне. Мікалай Яноўскі ацаніў сваю гаспадарку на 320 тыс. зл., а Мікалай Гаўрылюк на 350 тыс. зл. Крыху бядней жывецца меншасным радным Гарадской рады Беластока. Маёмасць Марка Масальскага, напрыклад, гэта больш за 300 тыс. зл., ды затое яго крэдыты сягаюць каля 250 тыс. зл. Адносна не самы багаты таксама Міхал Карповіч, аднак ён апынуўся сярод праверaных намі ўладальнікаў найбольшай колькасці нерухомасцей. У гэтым кантэксце проста аскетычна жывецца Славаміру Назаруку. Усё, што мае ён і зарабляе, і што здэкларараваў у маёмаснай заяве гэта сума ледзь (?) больш за 200 тыс. злотых.

Што можа быць цікавым, усе радныя, гарадскія і ваяводскія, з'яўляюцца ўласнікамі (найчасцей заяўляюць: сужэнская маёмасная супольнасць) дома і кватэры або кватэры. У гэтым сэнсе вяльможам з'яўляецца Яраслаў Матвяюк. У яго два дамы (395 тыс. зл. і 90 тыс. зл.) ды кватэра вартая 129 тысяч зл. Найбольш бледна тут выглядае віцэ-прэзідэнт Аляксандр Сасна з дзвюма кватэрамі вартымі 140 тыс. зл. і 70 тыс. зл. і — калі б прымаць пад увагу вартасць гэтых нерухомасцей — зноў Славамір Назарук (кватэра, да таго каператыўная — 80 тыс. зл.; дом — 40 тысяч злотых).

Раіна СТЭФАНЧУК

ВАЯВОДСКІЯ РАДНЫЯ

Ян Сычэўскі

— польская валюта: 380 тыс. зл. (капіталаўкладанні); 1 000 адзінак (Фонды: TFI KBC); 3 000 адзінак (нерухомасці); 1 450 адзінак (Warta Plus); 1 000 адзінак (Warta Zysk Azjat)

— замежная валюта: 1 тыс. 093, 74 еўра

— кватэра (58 кв. м.): 120 тыс. зл.

— кватэра (48 кв. м): 80 тыс. зл.

— 2 аўтагаражы: 30 тыс. зл.

— з занятку і пенсіі — 174 тыс. 171,78 зл.

Яраслаў Матвяюк

— польская валюта: 140 тыс. зл.

— дом (74,50 кв. м.): 90 тыс. зл.

— дом (223 кв. м.): 395 тыс. зл.

— кватэра (92,60 кв. м.): 129 тыс. зл.

— участак (4 тыс. кв. м.): 15 тыс. зл.

— гараж — варты 9 тыс. зл.

— дыета раднага: 20 тыс. зл.

— аўтамашына „Фольксваген-пасат": 23 тыс. зл. (1999 г.)

— аўтамашына „Таёта-ярыс": 33 тыс. зл. (2006 г.)

— з занятку, дамоў на працу, на твор і нарад: 140 тыс. зл.

— крэдыты: 39 490 зл.

Мікалай Яноўскі

— польская валюта: 55 тыс. зл.

— дом (160 кв. м.): 103 800 зл.

— сельская гаспадарка (50,69 га): 320 тыс. зл. (прыход: 84 тыс. зл., сярод гэтага даплаты з ЕС: каля 63,5 тыс. зл.)

— грунты (0,41 га): 1 тыс. 750 зл.

— трактар (1989): 30 тыс. зл.

— аўтамашына „Сеат-леон" (2000 г.): 28 тыс. зл.

— з занятасці: 68 тыс. 830 зл.

— наглядальная рада: 585,10 зл.

— наглядальная рада: 100 зл.

— дыета раднага: 10 009,50 зл.

— крэдыты: 30 тыс зл. (на ROR нявыкарыстаны)

Мікалай Гаўрылюк

— польская валюта: 41 тыс. 251 зл.

— замежная валюта: 1 тыс. 021 еўра

— дом (90 кв. м.): 90 тыс. зл.

— кватэра (48 кв. м.): 60 тыс. зл.

— шматтаварная гаспадарка (19,65 га): 350 тыс. зл. (прыход і прыбытак ад гэтага 10 тыс. зл.)

— гараж (18 кв. м.) — 5 тыс. зл.

— два трактары (1986 г., 1989 г.); дзве аўтамашыны „Рэно-меган" і „Кліё" (1996 г.) — цана не пададзена

— прыход і прыбытак ад асабістай гаспадарчай дзейнасці: 6 тыс. 390, 38 зл.; не пададзена форма дзейнасці

— прыход і прыбытак ад гаспадарчай дзейнасці з іншымі асобамі: 6,5 тыс. зл. (паі)

РАДНЫЯ ГОРАДА БЕЛАСТОКА

Андрэй Данялюк

— польская валюта: 30 тыс. зл.

— дом (135 кв. м.): 300 тыс. зл.

— кватэра (55 кв. м.): 115 тыс. зл.

— драўляныя пабудовы (0,17 га): 15 тыс. зл.

— гаспадарчая дзейнасць, пераклады, паслугамі: 46 тыс. зл.

— прыбыткі ад занятасці: 31 тыс. 944,13 зл.

— крэдыты: 35 тыс. зл.

Міхал Карповіч

— польская валюта: 20 тыс. зл.

— кватэра (57,2 кв. м.): 120 тыс. зл.

— дом (60 кв. м.), гаспадарчыя будынкі (137 кв. м.): 715 тыс. зл. (адна чвэрць нерухомасці)

— нерухомасць незабудаваная лясная (3,14 га) 5,4 тыс. зл. (палова нерухомасці)

— сельскагаспадарчая нерухомасць (1 077 кв. м.): 60 тыс. зл. (палова нерухомасці)

— незабудаваня нурухомасць выдзеленая на публічную дарогу (1 328 кв. м., 1/20 нерухомасці): 79 тыс. зл.

— незабудаваная сельскагаспадарчая нерухомасць 3,54 га, (палова нерухомасці): не пададзена цаны

— аўтамашына „Гонда" (1999 г.) 33 тыс. зл.

— прыбыткі ад занятасці: 33 тыс. 082,23 зл.

— член наглядальнай рады: 819,55 зл.

— дыета раднага: 26 тыс. 474,66 зл.

Славамір Назарук

— польская валюта: 10 тыс. 500 зл.

— дом (58,70 кв. м.): 40 тыс. зл.

— кватэра (59,90): 80 тыс. зл.

— аўтамашына „Фіат-сена" (2000 г.) 10,5 тыс. зл.

— заробкі ад занятасці: 33 тыс. 061,36 зл.

— дыета раднага: 20 тыс. 050,53 зл.

— членства ў адной з гарадскіх камісій: 3 тыс. 017,95 зл.

Марк Масальскі

— дом (110 кв. м.): 200 тыс. зл.

— кватэра (54 кв. м.): 60 тыс. зл.

— сельская гаспадарка (6,97 га): 16,5 тыс. зл. (гадавы прыбытак: 3,5 тыс. зл.)

— адпачынкавы ўчастак (689 кв. м.): 5 тыс. зл.

— прыбыткі ад дагавору на працу: 24 тыс. зл.

— дыета раднага: 18 тыс. 700 зл.

— крэдыты: 248 тыс. зл.

УПРАВА ГОРАДА БЕЛАСТОКА

віцэ-прэзідэнт Аляксандр Сасна

— польская валюта: 63 тыс. 197,58 зл.

— замежная валюта: 6 тыс. 127,37 фунтаў стэрлінгаў.

— кватэра (60,03 кв. м.): 140 тыс. зл.

— кватэра (32,60 кв. м.): 70 тыс. зл.

— незабудаваная нерухомасць (1,60 га); забудаваная нерухомасць з распачаццем пабудовы жылога дома (0,24 га): 70 тыс. зл.

— аўтамашына „Рэно-кангу" (2001 г.): цана не пададзена

— з занятасці: 95 тыс. 538,81 зл.

— дамова на твор: 200 зл.

— аўтарскія правы: 550 зл.

У Цеханоўцы пра беларускае

— У беларускай хатцы цяпер на стале, на лавах і на падлозе шмат сена, гэта ад Каляд, была і куцця, просвіра — усё рыхтавала адна гаспадыня з Плютыч, — сказаў Антоні Масевіч, старэйшы спецыяліст па этнаграфіі Музея сельскай гаспадаркі ў Цеханоўцы. Музей гэты мае свае беларускія зборы, м.інш. у беларускай хатцы, прывезенай з Сакоў (была яна ўласнасцю дзядоў Міхася Шаховіча). Апрача таго сюды былі прывезены экспанаты з Беларускага музея ў Белавежы.

— Можа быць, што калі б яны не апынуліся ў нас, шмат было б з іх страчана, — адзначае захвальнік. — Вашы гайнаўскія музейнікі былі ўражаны пазітыўна на тое, што я вам сказаў чатыры гады таму ў артыкуле. Яны не мелі выйсця, каб усяго гэтага не забраць, а і мы не ведалі, ці „ўправа, ці ўлева", бо праўна лепш было ўсё нам перадаць, і мець гэта „з галавы". Некаторыя экспанаты былі блага захаваныя, мы што маглі, закансервавалі, задбалі, хоць частка з іх не паказвалася. Было ўсяго больш за 300 штук. Пасля вашага тэксту ў „Ніве", згодна з дамовай, мы вярнулі ўсё камісіі, якая прыехала з Гайнаўкі. У час нашых перамоў у музей заехала была другая камісія з Гайнаўкі, таксама паказала паперы на свае паўнамоцтвы. Мы тут разгубіліся, не ведаючы, хто тут мае сапраўдныя правы на тое, каб маглі мы ім перадаць экспанаты. Пачалася гарачая сварка паміж гэтымі беларусамі і нам было няёмка. Урэшце, перадалі мы тыя экспанаты, каб не мець лішняга клопату. Думаю, што пра іх задбалі ў гайнаўскім музеі. Адно... ваш конік застаўся ў нас.

Пры маім коніку, адзіным з белавежскіх экспанатаў, які застаўся ў Цеханоўцы — драўляным конікугайданцы на палозах, якога зрабіла мая мама Зінаіда, майстар на ўсе рукі, ахвотна фатаграфуюцца наведвальнікі ў „майстэрні местачковага фатографа". А ў беларускай сакоўскай хатцы — уласныя зборы цеханавецкага музея, набытыя ім на беларускіх вёсках Падляшша. Зараз — а мы на ўрачыстым уручэнні ваяводскіх узнагарод захавальнікам драўлянай архітэктуры Падляшша — падыдзем у пару асоб у гэты тыповы колішні домік з сенцамі запоўненымі сельскімі прыладамі, абгароджаны плеценым з хворасту плотам, з агародчыкам, у якім летам зацвітаюць жоўтыя вяргіні і іншыя тыповыя для сялянскіх падворкаў кветкі (цяпер ён ахутаны ў гурбы снегу, таксама па-колішняму — аж пад вокны). Калісьці, расказвае Антоні Масевіч, у музеі праводзілася была сустрэча духоўных асоб, з якой раптам знік епіскап Сава — а ён зышоў паглядзець беларускую хатку, якая месціцца ў адмыслова падрыхтаваным краявідзе пасярод іншых будынкаў музея — падляшскіх хат, свірноў, клуняў, дзе і млын ёсць, і зёлкавы агарод (паводле класіфікацыі ксяндза Кшыштафа Клюка), і кузня, і сучасная гаспадарка, і ветэрынарная лячэбніца... Нас, вядома, найбольш цікавяць планы музея наконт здабывання нашых старажытнасцей і папаўнення збораў, якія прадстаўляюць усю падляшскую вёску.

— Ніякая ні таямніца, што мы стараемся для свайго музея здабыць каштоўныя экспанаты. Збіраемся перанесці такі ўзорны домік з ваколіц Храбалоў, Рыбалаў, прыгожа размаляваны беларускі домік ужо пасляваенны. Паставім яго каля сакоўскай хаткі, каб паказаць больш сучасную беларускую архітэктуру. Хочам таксама паставіць царкоўку; нам прапанавалі праваслаўную капліччу з ваколіц Браньска, мураваную, ды мы хочам драўляную, неабавязкова арыгінал — канчаткова можам зрабіць копію, каб паказаць узор. Паразмаўляю я з айцом Лявонціем Тафілюком наконт ікон і інтэр'еру.

— А як гэта можна перанесці штосьці? — цікавіцца Сцяпан Чабай, які таксама ў сваіх новаберазоўскіх хатках мае свой музейчык. — Гэта ж трэба дазвол захавальніка? Няма з гэтым праблем? Мая мара — паставіць на падворку яшчэ драўляны манеж. Ад бацюшкі перанясу з падворка, бо яму проста мяшае, непатрэбны.

— Перанесці можна. Мы перанеслі да сябе XVII-вечны касцёл з усім абсталяваннем і мясцовы захавальнік мусіць быць паінфармаваны. Можаце перадаць чытачам „Нівы", што запрашаем усіх да нас у Цехановец, бо варта пабачыць нашыя багатыя зборы, а нават пераначаваць, пабыць даўжэй. А ніўскі каляндар перадам маёй жонцы — апякуецца яна цеханавецкай царквой; напэўна спатрэбяцца ёй інфармацыі пра святы, пра пасты з такога дакладнага календара.

Міра ЛУКША

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Каля беларускай хаткі а. Сяргей Корх з Белавежы — і ён дбае аб драўлянае будаўніцтва

Яшчэ аб чыгунцы

У 45 нумары „Нівы" ад 4 лістапада 2006 года друкаваўся допіс М. Ц. „Яшчэ аб чыгунцы", у якім аўтар прад'яўляе ў мой адрас дзве заўвагі: першая — што я заразіў яго „хваробай" пісання ў „Ніву", другая — што без прычыны чапляюся чыгункі ды не выяўляю адрасата, які мог бы адгукнуцца на маю крытыку. Вось што скажу паважаны сябра! Першая заўвага цешыць мяне, а гэта таму, што мой штуршок даў станоўчы плён і, як пішаце, Вы сталі супрацоўнікам тыднёвіка. Дзякуючы гэтаму мы мелі нагоду сустрэцца на святкаваннях 50-годдзя „Нівы" і супольна правесці цудоўны вечар.

У рэпліцы пішаце так: „Усе Сідаруковыя заўвагі не надта дакладныя, не вядома каму адрасаваны. Пісаць агульна «чыгунка» можна было пры камуне, бо цяпер настаў лепшы час і колішняя чыгунка папросту не існуе". У мяне наконт гэтай справы іншая думка. Праблемы, якія я кранаў (сціск у вагонах, брудныя пачакальні, малая колькасць цягнікоў, неакуратна распрацаваныя расклады язды), ставіў я на грамадскі суд як паталагічныя з'явы, а тычыліся яны як пасажырскай перавозачнай службы, гэта значыць, прадпрыемства PKP Przewozy Regionalne Sp. z o.o. у Беластоку, так і Маршалкоўскай управы, да абавязкаў якой належыць арганізаванне чыгуначнага транспарту ў Падляшскім ваяводстве. Адрасат, значыцца, быў мне вядомы. Нягледзячы на тое, што допісы друкаваліся ў „Ніве", гэтыя праблемы выносіў я на сесіях Рады гміны ў Чаромсе, паколькі ў нарадах удзельнічалі прадстаўнікі згаданых устаноў. Асабіста прад'яўляў я іх дырэктару Прадпрыемства рэгіянальных пасажырскіх перавозаў у Беластоку Галіне Кужыне. А наконт чыгункі скажу такое. Памылкай было ліквідаванне Акруговых дырэкцый ПКП. Маёмасць вартую шмат мільёнаў злотых, якую выпрацоўвалі чыгуначнікі дзесяткамі гадоў, перадалі (без граша!) ва ўладанне новазаснаваным суполкам, што мела паўплываць на лепшую арганізацыю працы прадпрыемства. А што атрымалася? У рамках эканоміі ліквідаваліся штаты рабочых, а на іх месца, як грыбы пасля дажджу, з'яўляліся новыя начальнікі з высокімі зарплатамі. На мадэрнізацыю транспарту і рамонт чыгуначных ліній, разумеецца, не хапала грошай. Затым надышоў час збываць маёмасць. А як гэта адбывалася пакажу на прыкладах.

У мінулым годзе, з віядука на лініі Чаромха — Беласток, які знаходзіцца непадалёк Кузавы (з боку Кляшчэляў) прыватная фірма вылупіла каля сотні чэсаных камянёў. Здзелка, на маю думку, адбылася на аснове пагаднення з кіраўніцтвам суполкі PKP Polskie Linie Kolejowe S.A. у Беластоку. Віядук быў будаваны пры канцы XIX стагоддзя. Складае ён частку стратэгічнага сектара дзяржаўнай гаспадаркі. Няўжо Міністэрства транспарту дазваляе на разбуранне так важных аб'ектаў? Хто выдае такі дазвол? І яшчэ адно. Гэтая ж суполка пачала ліквідаваць засцерагальную паласу дрэў і кустоў, якая мяжуе з пуцямі побач чыгуначных ліній. Высечкай дрэў на апал займаліся працаўнікі чыгункі, якія выкупілі ўчасткі ў PLK. Не было б у гэтым нічога дзіўнага, каб не факт, што на высечку кустоў дазвалялі рабочым ды пенсіянерам, а векавыя сосны прызначылі... начальнікам.

Уладзімір СІДАРУК

Басі Пякарскай

(у саракагоддзе)

Бася мілая, як лекар,
Ты прафесійна і ўмела
Прыпісваеш людзям лекі
Лечыш хворыя іх целы.

Ды аднак у нашай глушы,
У айчынным нам Падляшшы,
Хворыя Ты лечыш душы
Тых усіх тутэйшых нашых.

Хочаш Ты вярнуць ім памяць
Аб айчынным іх народзе,
Каб усведамілі самі:
Хто яны, адкуль паходзяць?

Поспехаў Табе ў змаганні
І чарговых юбілеяў,
Здароўя, шчасця і прызнання,
Веры, Любові і Надзеі.

Віктар ШВЕД

Беласток,
24 студзеня 2007 года

Як працуе Польскі саюз невідучых?

Наш чытач (імя і прозвішча яго вядомае рэдакцыі) з вёскі ў Нараўчанскай гміне (Гайнаўскі павет) напісаў 18 верасня 2006 года прашэнне ў бюро Польскага саюза невідучых Падляшская акруга ў Беластоку і папрасіў фінансавай дапамогі на паправу здароўя. Ён з'яўляецца інвалідам першай групы і мае малую пенсію. Лекар-акуліст прыпісаў яму дарагія кроплі да вачэй. Дагэтуль былі яны напалавіну таннейшыя, але ўжо безрэзультатныя, не дапамагалі. Да таго ж па накіраванні ўрача-акуліста дайшлі пілюлі, прыпісаныя другім лекарам-неўролагам. Зноў выдатак.

Да прашэння хворы далучыў лекарскае пасведчанне, фактуры, ЗУСаўскі перавод і г.д. Членскія ўзносы на ПСН ён аплачвае чацвёрты год.

Адказ не прыходзіў, дык зноў паўторна напісаў у ПСН 14 снежня 2006 года. Зараз ужо люты 2007 года. Наш чытач чакае, ці дачакаецца? Як вядома, не самымі лякарствамі чалавек жыве. Неабходна ж таксама купіць дровы на зіму, заплаціць рахункі за электраэнергію, ваду, тэлефон ды за праезды да лекара і г.д. Наш чытач прашэнне ў ПСН напісаў першы раз. Апынуўся ў цяжкім убостве. Значыць, не без дай прычыны.

Ці так можна абыякава адносіцца да невідучых або паўсляпых? Ажно цяжка паверыць, што так усё ж бывае. Факт гэты фактам. Дзе такая-сякая людская прыстойнасць і літасць, дзе спачуванне другому чалавеку? Ці аж так нячулыя чыноўнікі працуюць у ПСН у Беластоку?

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

— 59 —

— Вось і канец! — уздыхнула Гражынка і кінула сшыткі на стол. — Цяпер пачынаюцца... усходы. Экзамены, экзамены!

— І так да канца, — уздыхнула не лягчэй бабуля.

— А трэба быў вам, мама, той экзамен на вадзіцельскія правы? — азваўся тата. — Трэба было б куды паехаць — падвезлі б вас спадарства Казлы. А то і машыну купляй, калі правы ўжо ёсць.

— Хапіла б маленькая, якраз на чатыры асобы, бо мы ж з Мікіткам мала месца займаем, — хуценька ўключыўся Грак: трэба каваць жалеза, пакуль гарачае!

— Гэта немагчыма! — тата ўскудлачыў чуб, як тады, калі вельмі ўзбураны і злосны. — Калі б купляць машыну, дык ужо акуратную, не з другіх ці трэціх рук, і ўжо якуюсьці больш самавітую, не на смех, каб без сораму на дарозе паказацца. А такую раз-два і ўкрадуць. А колькі такая жарэ! Мы ж з торбамі пойдзем!

Мікітка спалохана глянуў на Грака: а каму яшчэ патрэбная ў хаце такая жыркая машына і чаму ды куды гэта ўся сям'я мае ісці з торбамі?

— Можна купіць нам і новую, возьмем у крэдыт — банкі ідуць цяпер людзям на руку, паніжаюць працэнты... — ажывілася бабуля і зірнула на Гражынку.

— Ой, і на руку хтосьці пойдзе... людзям! — Мікітка аж падагнуў сваю лапку: ведаў што гэта такое, калі хтось камусьці па ёй пройдзецца, вядома, выпадкова, ды каб знарок?!

— Мы ж утраіх яшчэ зарабляем, — кавала жалеза бабуля. — Неяк справімся з даўгом. І Гражынка нам расце, зараз у школу новую пойдзе...

Гражынка была ўжо забылася пра свой першы клопат, бо і яе захапіла ўява ўласнага аўто, а тут зноў...

— Экзамены! Зрабілі нам, вось, экзамен на канец пачатковай школы...

— Ці не зарана?.. Ты што мне хочаш сказаць?! — раптам насцярожыўся тата. — Дарэчы, не канец свету, калі што...

— Нічога благога. Пробны быў. Справілася, вядома. Ды раптам прыйшло мне ў галаву, што гэта ўжо канец. Дзяцінства...

— Гр-р-р-р-ажынка! — Граку ад хвалявання захрыпела ў горле. — То мы ўжо... р-р-р-р-аптам дар-р-р-рослыя зр-р-р-р-рабіліся?!

Міра ЛУКША

МЫ НЕ ЧУЖЫЯ, МЫ Ў СЯБЕ

Пад канец студзеня мне пашчасціла пабываць у хаце Дануты і Фёдара Міруцёў у Бандарах. Калі я ўжо меў уваходзіць на парог, каля мяне з'явілася маленькая дзяўчынка з віншавальным лістом у руках. Яна акурат прыехала з бацькамі з Беластока. Вядома, я гэтую маленькую персону прапусціў першую і адкрыў ёй першыя і другія дзверы. Заўважыў я на віншавальным лісце размаляваныя тры сэрцы. Дзяўчынка прыпаднесла ліст бабулі і дзядулю ды прачытала наступныя словы: „Хто бабулю і дзядулю мае, так як я іх кахае".

Прызнаюся, што я быў гэтым здарэннем шакіраваны. Калі стаў я распытваць, дзяўчынка сказала мне, што называецца Бася Лук'янюк, ёй 4 годзікі і ходзіць яна ў Прадшколле № 14 у Беластоку. Затым малеча стала дэкламаваць па-беларуску вершыкі і праспявала адну песеньку, а мы ўсе ёй апладзіравалі. У нашай маленькай артысткі вочкі блішчэлі быццам зорачкі на небе. Я далей стаў распытваць дзяўчынку, бо мне цікава было ведаць, хто з'яўляецца апекуном дзяцей у згаданым садку, хто так умела, прыгожа і разумна фармуе свядомасць дзяцей, прывівае ім любоў да роднага. Аказалася, што выхавацелькай дзяўчынкі з'яўляецца Анна Бабік.

У адрас спадарыні Анны Бабік выказваю словы пашаны і павагі. Я вельмі задаволены яе выхаваўчымі поспехамі, якія я пабачыў у асобе ўнучкі спадарства Міруцёў. Я ўпэўнены, што Прадшколле № 14 у Беластоку гэта наш гонар, візітная картачка ўсіх беларусаў. Гэта дзякуючы педагагічным кадрам і разумным бацькам мы можам ганарыцца маладым пакаленнем.

У далейшым 4-гадовая Бася прачытала: „Сардэчна запрашаем на свята бабулі і дзядулі 22 студзеня 2007 года а гадзіне 9.30 — твая ўнучка Бася".

Хай гэты дзіцячы садок і надалей славіцца сваімі поспехамі на радасць нашым дзеткам, бацькам і педагогам, чаго ад шчырага сэрца жадае ніжэйпадпісаны.

Віктар БУРА

Сёлета ў прадшколлі

Анна Бабік

Пазнаем алфавіт

Гульня ў школу

Старэйшы брат кажа малодшаму:

— Давай у школу пагуляем. Хочаш?

Малодшы брат крыху падумаў і адказаў:

— Хачу. Але я не ўмею ў школу гуляць.

— Гэта вельмі проста, — прамовіў старэйшы брат. — Я буду настаўнікам, а ты — вучнем. Я табе буду тлумачыць, а ты слухай. Згодны?

— Згодны, — сказаў малодшы брат.

Старэйшы брат, стараючыся, каб зразумеў яго малодшы, пачаў тлумачыць:

— Кожнае слова мае пэўнае значэнне. Вось, напрыклад, слова „жар".

— Шар? — пытаецца малодшы брат.

— Не шар, а жар.

— Не шар, а шар, — прагаварыў малодшы брат.

— Не так, — сказаў старэйшы брат. — Жар. Паўтары: жар.

— Шар, — гучна прамовіў малодшы брат.

Старэйшы брат аж падскочыў.

— Жар!

А малодшы кажа:

— Шар!

Уздыхнуў старэйшы брат:

— Возьмем другое слова — „жах". Скажы: жах.

— Шах, — сказаў малодшы брат.

Узлаваўшыся, старэйшы брат крыкнуў:

— Жах!

А малодшы брат яшчэ мацней крыкнуў:

— Шах!

Сядзяць, гукаюць, нібы ў лесе.

Адзін крычыць:

— Жах!

Другі крычыць:

— Шах!

Нарэшце надакучыла гэта старэйшаму брату, махнуў ён рукою:

— З табою ў школу гуляць — адзін жах! Анічога ты не разумееш.

Малодшы яму ў адказ:

— Разумею. Шах.

Не вытрымаў старэйшы брат, выскачыў на двор, сеў на лаўку і паўтарае:

— Жах, жах...

А мне хацелася б запытацца ў вас: словы „жар" і „жах" з якой літары пачынаюцца?

(працяг будзе)

Аляксей ЯКІМОВІЧ

„Займальны алфавіт"

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

—16—

Два дні пасля дня нараджэння Адася я даведалася ад самога гаспадара гэтай імпрэзы, што пакінула там рукавічкі. Адась напісаў мне эсэмэску і прапанаваў, каб мы сустрэліся. Хлопец вельмі мне падабаўся, таму пасля яго званка я ад радасці скакала па ўсёй бабулінай хаце. Я хуценька паведаміла мае сяброўкі, прасіла ў іх дапамогі. Віялета з Мартай згадзіліся схадзіць са мной у вёску Адама. Разам мы абдумалі план майго рандэву: у той час, калі я буду гаварыць з хлопцам, яны пойдуць да Ані, класнай сяброўкі...

Наступнай раніцы я прачнулася ў пяць гадзін. Памыла галаву, падмалявалася, выпрастала валасы і надзела найлепшыя апранахі. У сем гадзін я паснедала, пасля памыла зубы. Усе сваякі пыталі: „А дзе ж ты так выстраілася?" Я не хацела ім гаварыць пра Адася:

— Дзяўчатам трэба ў бібліятэку! — зманіла я.

Перад восьмай гадзінай мы з Віялетай і Мартай выйшлі з хаты маёй бабулі. Да вёскі, у якой жыве Адам, мы ішлі няпоўную гадзіну. Ён ужо чакаў нас у вясковай краме. Дзяўчаты, згодна з планам, наведалі Аню, а мы з Адамам пайшлі на шпацыр. Мы хадзілі па вёсцы і гаварылі пра школу, пра сяброў, пра зоркі і планету Сатурн. Я даведалася, што мой новы знаёмы з'яўляецца сябрам нашага Матвейкі, яны разам пабывалі на летніку. Ну, а рукавіцы, якія прынёс мне Адам... не былі мае! Яны былі завялікія. Пасля Адам прызнаўся, што рукавіцы былі толькі зачэпкай для таго, каб нам яшчэ сустрэцца. Нягледзячы на тое, што мне было холадна ў рукі, я цешылася, бо хлапец мне вельмі падабаўся. Пасля ён аддаў мне свае рукавіцы, яны добра пасавалі да маёй рукі і пальцаў.

Мы шпацыравалі мо з дзве гадзіны, аж падышлі да нас дзяўчаты і папрасілі, каб вяртацца дамоў. З Адамам я дамовілася на пятніцу. Ён паабяцаў, што прыйдзе ў вёску маёй бабулі. У паваротнай дарозе Віялета і Марта павіншавалі мяне. Адась быў найлепшым вучнем у іх школе (і самым высокім хлопцам). Ён гаварыў, што ў жыцці хоча стаць астранаўтам або спартсменам. Мы жартавалі, смяяліся, пляткавалі пра ўсіх мясцовых хлопцаў.

Раптам пачуўся гул машыны. У наш бок ехала аўто. Гэта быў Марк, маё першае каханне, у якім я закахалася, калі мне было два годзікі. Марк абагнаў нас і нават не спыніўся, быццам і не заўважыў нас. Гэта, вядома, узбурыла нас, а найбольш мяне.

Тэкст:<natasza 9922@wp.pl>
Дызайн:<lolcia 05@wp.pl>

Вершы Віктара Шведа

Два погляды

Стаіць на дарозе хлапчына,
Да яго набліжаецца машына.
— Гэта ж не трамвай, так ці не?
Напэўна мяне абміне.

А ў той жа час вадзіцель
Інакш разважае быццам:
— Гэта ж не слуп, а мужчына,
І ён адысці павінен.

Ці выкіпела малако?

Плача горкаю слязой
Раптам хлопчык невялічкі.
— Пэўна брат галодны мой,
Дай яму, матуля, цыцкі.

— Дык няма ўжо малачка
У грудзях маіх, Сярожа,
Для маленькага сынка.
— А што, выкіпела можа?

Галерэя „Зоркі" (Беласток)

Ганна Пякарская

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: 5,5.

Твая мянушка: У мяне няма мянушкі.

У жыцці хачу стаць, чаму: У жыцці хачу стаць акцёркай, таму што я вельмі люблю тэатр. Я хацела б таксама быць псіхолагам, бо вельмі люблю дапамагаць людзям у патрэбе. Бачу сябе таксама юрыстам.

У сяброў цаню: У сяброў цаню праўдзівасць. Таксама люблю калі ў маіх сяброў адзначаецца такая рыса характару, як „шалёнасць".

Не люблю: Калі нехта хлусіць, не люблю калі мяне кантралююць, кажуць з кім я маю сябраваць. Не люблю таксама калі мае сябры не звяртаюць на мяне ўвагі.

Па-беларуску размаўляю: з мамай, татам, сястрой, паняй Алінай, з сябрамі, бабуляй і дзедкам.

Мой любімы гурт: „Н.Р.М.", „Крама", „Чырвоным па беларуску", а таксама Пётр Рубік і многа, многа іншых гуртоў.

Каля свайго дому пасаджу: Я не люблю займацца агародам і не прадбачваю садзіць кветак, хіба што будзе ў мяне працаваць агароднік.

Польска-беларуская крыжаванка № 6



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 2: Курс, эмір, сам, вінаград, маліна, доза, гразь, ода, мат, смак, ява. Кроў, дом, мода, вазак, сіла, сані, манга, гарт, мір, рэдзька.

Узнагароды, **ланцужкі для мабільнікаў за знакам „Зоркі"**, выйгралі: **Кася Саковіч, Аня Каліноўская** з Чыжоў, **Пётр Юрчук, Магдаліна Сахарчук, Марта Трашчотка** з Бельска-Падляшскага, **Рафал Скепка** з Дубін, **Магда Куптэль, Паўля Шыманюк, Лукаш Сахарчук, Юстына Іванюк, Наталля Сахарчук** з Гайнаўкі. **Віншуем!**

У Гміннай бібліятэцы ў Дубічах сустракаю вучняў Падставовай школы з апекунамі, бібліятэкаркай Міраславай Семянюк-Мараўскай і настаўніцай Нінай Добаш-Карпюк. Дзеткі выконваюць святочныя аздабленні...

Выхоўваць з пашанай да свайго

Вучні Комплексу школ у Дубічах-Царкоўных ахвотна спатыкаюцца ў Гміннай бібліятэцы і святліцы на пазаўрочных занятках. Дзеці і моладзь знаёмяцца з гісторыяй свайго наваколля, захаванымі даўнімі вясковымі традыцыямі і абрадамі. На спатканні з маладымі людзьмі прыходзяць вяскоўцы і вучаць іх даўнім хатнім заняткам, якія занікаюць з цывілізацыйнымі пераменамі, а таксама знаёмяць з простым рамяством, якое яшчэ захавалася ў Дубіцкай гміне (пляценне з саломы ці лазы). Вучні выязджаюць на экскурсіі і знаёмяцца з навакольнай расліннасцю, птушкамі і звярынай. Гавораць з мясцовымі людзьмі, якія ад бацькоў навучыліся жыцця ў суладдзі з прыродай. Цікавыя для вучняў выезды ў Беласток і іншыя мясцовасці. У Ляўкове дзеткі вучыліся ляпіць з гліны, а ў Студзіводскім музеі малой айчыны, рабіць саламяны павук. Тканыя і вышываныя вырабы, якія яны ўбачылі ў Студзіводах, напомнілі вучням пра іх самастойныя працы выкананыя ў Дубічах пад наглядам вясковых інструктараў.

У Гміннай бібліятэцы ў Дубічах сустракаю вучняў Падставовай школы з апекунамі, бібліятэкаркай Міраславай Семянюк-Мараўскай і настаўніцай Нінай Добаш-Карпюк. Дзеткі выконваюць святочныя аздабленні. Вядуць яны мяне ў святліцу, што знаходзіцца над бібліятэкай, каб паказаць выстаўку сваіх лепшых работ, якія выконвалі на пазаўрочных занятках. Дзяўчаты затрымліваюцца побач вырабаў з драўніны і ракіты.

— Хлопцы лепш умеюць вырэзваць у драўніне, а нам добра атрымлівалася збіванне драўляных вырабаў, — кажа Эдыта Наўроцкая і паказвае на кармушкі, воз і кошычкі. — У пляценні дапамагалі нам нашы апекуны, бо гэтая работа вельмі складаная.

Побач драўляных вырабаў вісяць вышываныя працы.

— Карысталіся мы беларускімі ўзорамі, якія ўзялі ад сваіх бабуляў, — тлумачыць Міраслава Семянюк-Мараўская. — Больш складаныя працы дапамагаюць дакончыць дома нашы мамы і бацькі.

— Нашы інструктары паказвалі нам, як калісь працавалася з лазой, саломай або палатном і пазней мы самі стараліся рабіць уручную. Складаным для нас пляценне з саломы і таму мы выконвалі толькі саламяныя падстаўкі, — гавораць Эдыта Наўроцкая і Аня Ярымовіч.

Спадабаліся вучням заняткі з глінай, на якія моладзь ездзіла ажно ў Ляўкова.

— Мы ляпілі прадметы з гліны, а пасля сушылі нашы вырабы, — дзяўчаты з радасцю ўспамінаюць свой выезд у ляўкоўскую святліцу.

— Гаварыце па-свойму, — заахвочвае дзяўчат бібліятэкарка Міраслава Семянюк-Мараўская і дадае: — Многія нашы дзеткі гавораць яшчэ з бацькамі на дыялектнай мове.

Караліна Місяюк і Юстына Хадакоўская, якіх апякун заахвочвае гаварыць па-свойму, не пярэчаць, што размаўляюць дома так як іх бацькі.

У бібліятэцы і святліцы збіраецца многа вучняў (злева Міраслава Семянюк-Мараўская, справа Ніна Добаш-Карпюк)

Іншыя дзеткі таксама хочуць пахваліцца, што дома гавораць на роднай мове і расказваюць як дома гавораць іх бацькі. Да шчырай размовы найбольш ахвотныя малодшыя вучні, якіх цікавяць размовы на розныя тэмы.

— Мая бабуля, што жыве ў Чахах-Арлянскіх, яшчэ тчэ на кроснах, — заяўляе адна з дзяўчат. Іншая вучаніца дабаўляе, што яе бабуля, якая жыве ў Грабаўцы, пляце яшчэ каробкі.

— Старыя заняткі і нашыя традыцыі трэба перадаваць з пакалення ў пакаленне, каб яны не загінулі, — кажа Караліна Місяюк. Дзяўчаты напамінаюць, што ў вёсках Дубіцкай гміны яшчэ не загінула традыцыя калядавання і пачынаюць расказваць як калядуюць у іх сёлах. Рады яны калі могуць спяваць і за сабраныя грошы нешта купіць.

— Калядаванне — справа не ў грашах, гэта сустрэчы дзеля падтрымання традыцыі, — гаворыць Караліна.

Пані Міраслава пачынае хваліць дзяўчат за ўдалыя работы, якія выконвалі ў час заняткаў у святліцы, а пасля канчалі дома.

— Старэйшыя дзяўчаты гэта новыя інструктарскія кадры. Яны ўжо могуць вучыць малодшых вучняў традыцыйным вясковым заняткам, — кажа Міраслава Семянюк-Мараўская і называе Касю Гаўрылюк ды згаданых ужо мною дзяўчат.

Апекуны пазаўрочных сустрэч не скрываюць, што сродкі на арганізаванне заняткаў удалося прыдбаць дзякуючы адмысловым праектам.

— Спачатку мы працавалі ў рамках праекта „Святліца, маё месца", займаючыся мануальнымі працамі, якія трэба было выконваць без дапамогі камп'ютэраў і іншай тэхнікі. Апрача вяртання да мясцовай традыцыі дзеткі вучыліся іграць на музычных інструментах, — успамінае Міраслава Семянюк-Мараўская. — Пасля былі іншыя праекты.

— Добра, што вучні маюць нагоду пазнаёміцца з гісторыяй наваколля і цікавымі расказамі з мінулага. Нашы дзеткі вучацца даўнім вясковым заняткам, якія для іх зусім новыя, — гаворыць настаўніца Ніна Добаш-Карпюк.

Многія вучні пацвярджаюць, што зараз не сустрэнеш у іх вёсках многіх даўніх заняткаў. Аднак некаторых дзяўчатак іх бацькі вучаць рукадзеллю.

— Мяне мама і бабуля вучылі вязаць кручком і на прутках, — кажа Аня Ярымовіч, якая разам з некалькімі сяброўкамі вылучаецца таксама ў час ручных работ у святліцы.

Дзеткі ахвотна ўключаюцца ў прапанаваную ім работу (з вучнямі працуе Ніна Добаш-Карпюк)

У час маёй пабыўкі ў школе дзяўчаты выконваюць упрыгожанні, якія можна павесіць дома — выявы хатніх або лясных жывёл. Каб выканаць свінку або мядзведзя, карыстаюцца вялікай колькасцю паперы і клеем падрыхтаваным паводле бабуліных рэцэптур.

— Спачатку мы надзьмулі шарыкі, а пасля іх абклейвалі паперай. Клей выканалі з мукі і вады, — тлумачаць дзяўчаты, якія размалёўваюць звяркоў акварэльнымі фарбамі.

Хлопцаў цяжэй заахвоціць да размовы. Адыходзяць яны ад нас і займаюцца гульнёй.

— Важна, каб заахвоціць да работы ўсіх вучняў і таму мы прыдумваем розныя працы і гульні. Некаторыя хлопцы найахвотней сядзелі б ля камп'ютэраў, — гаворыць спадарыня Семянюк-Мараўская.

Дзяўчаткі, з якімі я размаўляю, цікавяцца працай у „Ніве", бо раней наведалі нашу рэдакцыю ў Беластоку. Кажуць, што знаёмяцца са зместам нашага тыднёвіка ў школе, на занятках беларускай мовы, якія вядзе Марыя Казімірук. Могуць таксама чытаць „Ніву" ў бібліятэчнай чытальні.

— Мой бацька купляе „Ніву" і чытае яе дома, — кажа Магдаліна Петручук.

— А мой бацька чытае „Ніву" ў школе і таксама купляе дамоў, — дабаўляе Караліна Місяюк.

На заняткі ў бібліятэку і святліцу прыходзяць не толькі вучні з Дубіч. Дзетак з Грабаўца ці Елянкі па суботах прывозяць і адвозяць іх бацькі. Калі вучні астаюцца на дадатковыя заняткі пасля вучобы ў школе, таксама бацькам трэба за імі прыязджаць. Робяць гэта па просьбе дзетак.

— Мы ў нашай бібліятэцы і святліцы прыемна праводзім час, — заяўляе Аня Ярымовіч.

— Кожнае рукадзелле, якому тут навучымся, пасля можа спатрэбіцца ў нашым жыцці, — кажа Караліна Місяюк.

— Мы хочам таксама навучыцца новаму, — дабаўляе яе сяброўка Эдыта Наўроцкая.

— Такія заняткі адцягваюць нас ад тэлевізара і камп'ютэра, — разважае Сільвія Філіповіч, якая лічыць, што частыя пасядухі каля шклянога экрана шкодныя для здароўя. — Калі будуць тут заняткі, будзем прымаць у іх удзел як найдаўжэй.

Міраслава Семянюк-Мараўская пералічвае інструктараў, якія найбольш працавалі з вучнямі: Ніна Ефімюк, Марыя Нічыпарук, Ірэна Ляўчук, Параскева Семянюк, Анна Леанюк, Віктар Тамчук, Мікола Корх, Анна Фіёнік, Вера Дзік, Зіна Гаўрылюк і Людміла Карпюк.

На заняткі ў бібліятэку і святліцу будуць прыходзіць штораз малодшыя дзеткі. Апекуны маладых людзей прадбачваюць надалей ставіць на знаёмства з жыццём у мінулым і мясцовымі традыцыямі, у якіх выхоўваліся бацькі і дзяды вучняў.

Тэкст і фота
Аляксея МАРОЗА

Успаміны Янкі Крупы

Для сваіх людзей

(працяг з 5 н-ра)

Шчэцін

У Шчэціне прабыў я адзін сезон, больш не мог. Выступаў у аперэтах, м.інш. „Марыца" Кальмана і „Птушкалоў" Цэлера. Я хачу вяртацца ў Беласток, а мяне дырэктар не адпускае. Я ўжо ў Беластоку з Юзвюком дамоўлены, ён мне штат трымае. І каб вырвацца з гэтага капкана я папрасіў сям'ю, каб мне тэлеграму прыслалі, што маці ўмірае. З гардэробшчыцай, украінкай, дамовіўся пакінуць ёй у клуначку тэатральныя рэчы, што ў мяне былі, для здачы. Акурат вадэвіль ішоў „Дзякуй, Ева", і тэлеграма. Паехаў я, і ўсё. Толькі пасля пашпарт у Шчэцін паслаў, каб адштампавалі і пасведчанне аб працы прыслалі. Не мог там...

Але ў Музычным тэатры я папоўніў адукацыю па рэжысуры, кампазіцыі, працы з аматарскімі калектывамі. Да гэтага, у Беластоку, апрача вучобы ў ансамблі Гіжэўскай, я яшчэ вучыўся харэаграфічнаму майстэрству ў балетным вучылішчы пад кіраўніцтвам прафесара Кірылы Янушкоўскага. Харэаграфічныя штудыі я закончыў у Варшаве, да таго ж яшчэ апякунча-выхаваўчую педагогіку на Філіі Варшаўскага універсітэта ў Беластоку.

Таварыства

І так я зноў вярнуўся працаваць у Беларускае грамадска-культурнае таварыства. Не быў гэта лёгкі час, бо праца культурна-асветнага інструктара не за сталом, трэба было ехаць у людзі. Каб нешта здзейсніць, трэба было да людзей дайсці. Раз кажу дашоўскаму бацюшку: я мушу да людзей хадзіць, а табе лепш, бо да цябе ідуць і яшчэ нясуць. Была ў нас бяда з праграмамі. Цяпер колькі да нас спецыялістаў з Беларусі прыязджае, а калісь жа гэтага не было. І было пастаяннае ўмяшальніцтва ў нашы праграмы, напр. была песня з фразай „мой родны Мінск" і яе трэба было замяніць на „старынны Мінск".

Сяргей Карніловіч прыслаў мне са Злучаных Штатаў зборнік песень, там была песня „Васілёчкі". Зборнікам карыстаўся Сяргей Лукашук і ад гэтай песні ўзяў назву вакальна-інструментальны калектыў у Бельску.

Спачатку быў вялікі націск на беларускасць, на літаратурную мову. Аднойчы дзве спявачкі спявалі, адна на літаратурнай мове, а другая на мясцовай гаворцы. У журы адзін пра апошнюю сказаў: гэта ж не па-беларуску. А Стась Пазнанскі прайграў яшчэ раз абедзве на магнітафоне і пытае: то хто тут павінен узяць першае месца?! Пасля наступіла змена ў другі бок. На адным з конкурсаў можна было спяваць усё, хто што ўмеў. Ну і прагучалі песні Паломскага і Сантар, а іх выканаўцы былі ўзнагароджаны. Але такі агляд толькі раз быў.

Было ўмяшальніцтва і ў іншыя дзялянкі беларускай дзейнасці. А мы, беларусы, баімся думаць, каб хто яшчэ не падумаў, што мы думаем не так як трэба. Вось была заўвага, каб у „Беларускіх календарах" не пазначаць царкоўных святаў. Актывісты БГКТ былі партыйныя: — To po co wam święta? — пыталі іх. Або справа беларускага музея. У Белавежы адзін чалавек аддаваў будынак пад музей. Але зверху хтось сказаў, што тут не трэба. Калі так сказалі, то нашы пааддавалі тыя унікальныя экспанаты, што людзі бескарысліва, ад шчырага сэрца, здалі для справы захавання нашай спадчыны. А ў Цеханоўцы разумныя людзі былі і ўсё наша дабро забралі. Глядзеў я калісь здымак, на якім Мікола Самоцік трымае ў руцэ музейную саху. А нейкі чалавек збоку заўважыў: ён і кокнуў той музей.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Людзі

З сямідзесятых гадоў сталі ладзіць агляды — павятовыя і цэнтральныя. А каб заахвоціць спевакоў, я гаварыў ім: спявайце як умееце. Ай, будуць з нас смяяцца, адказвалі. Не будуць, падбадзёрваў я іх, пабачыце. І такім чынам на Гайнаўшчыне я мо з пятнаццаць калектываў сарганізаваў. Прыходзіла шмат царкоўных пеўчых, яны ўжо мелі падрыхтоўку.

Былі вакалісты з выдатнымі галасамі. У Чаромсе — Ганна Кердалевіч. У Градалях Саня оперны голас мела. У Новай Волі цудоўныя галасы мелі Клаўдзія Дамань і Марыя Сак. Яны тады сабе ўборы шылі. А якія паслухмяныя былі, здысцыплінаваныя. Іван так казаў! — гаварылі; і так мусіла быць! У Гаркавічах, Сукавічах і Піражках тры сястры былі — ах, як яны спявалі! У Тапарках былі Клаўдзія Бакун і Вера Роля, у Трасцянцы Анна Стахвюк... У Арэшкаве былі Надзя Грушэўская і пакойная ўжо Гандзя Парфянюк, у іх быў выдатны голас і слых. У Дабрывадзе была Нінка Ліпінская, яна магла б і ў хоры Пятніцкага спяваць. Называлі яе Сібірачкай, бо з мацераю з Сібіры вярнулася. І яна як на вуліцы заспявала, то на пару кіламетраў чуваць было: як Мардасава або Зыкіна. Былі і іншыя дзяўчаты, але калі павыходзілі замуж, то ўсё распалася. І ў Плёсках добрая вакальная група была. У Плёскі мы з Нявінскім паехалі. Ідзем ад шашы ў вёску, слізгата. Нявінскі кажа мне: ты, Ванька, толькі акардэон трымай, бо як я ўпаду, то нічога... У Орлі быў Радзівон Агіевіч, вёў ён царкоўны калектыў; яны спявалі ваенныя песні, то пра Разіна, то пра Днепр, а я хацеў, каб спявалі мясцовыя... А яшчэ ж Гарадок, а іншыя мясцовасці...

Спачатку на рэпетыцыі ўсе вясковыя жанчыны прыходзілі. Калі яны хадзілі калядаваць, то той, што паскудна спявала, даручалі грошы збіраць. І мне трэба было неяк рашаць гэтую праблему. То я прасіў заспяваць індывідуальна. І такую з боку стаўляў; гаварыў: не гневайся. І на галасы іх дзяліў. Яны слухалі і хвалілі, што вельмі прыгожа выходзіць: ой, каб ты так заўсёды перад намі стаяў! Я так не магу, адказваў я, вучыцеся самі.

Рэпетыцыі найчасцей у школе адбываліся. Жанчыны ішлі масава, „бо то Янка Крупа прыехаў". І я ездзіў ад вёскі да вёскі, ад Бобры да Буга. Колькі я кіламетраў схадзіў, а колькі раней кіламетраў на сцэне вытанцаваў!

Заехаў я ў Бабікі, а адтуль у Гаркавічы трэба. А снег такі падае, што дарогі не відаць. Едзе чалавек фурманкай, салому вязе; я яго пра тую дарогу пытаю. А ён кажа: ідзі маім следам, я салому пагубіў, па ёй ты ў Гаркавічы зойдзеш. Іду я, зайшоў на нейкую горку і след абарваўся. Але глянуў з горкі ўніз, а там і мае Гаркавічы. Змёрз. А там ужо мне валёнкі далі, абагрэлі. Так я і ногі адхадзіў. Хворыя яны ў мяне цяпер не ад танцаў, але ад тых кіламетраў, ад сырасці, ад прастуды. І бывала так, што я ў Беластоку ў хату не заходзіў, спяшаючы з рэпетыцыі на рэпетыцыю, і сын мне бутэрброды да аўтобуса на Юравецкую прыносіў...

З часам выканаўцаў сталі дзяліць на катэгорыі, на дуэты, тэрцэты, каб больш людзей узнагароджваць. Пазней быў чарговы падзел: на аўтэнтычны фальклор і апрацаваны фальклор. І ўзнагарод многа было, было многа спонсараў. І людзі цешыліся ўзнагародамі. А да ўсяго гэтага яшчэ здымкі ў „Ніве" былі! Паехаў я аднойчы ў Дашы з „Нівай", а ў тым нумары былі велікодныя віншаванні мітрапаліта Васілія, а знізу здымкі нашых народных калектываў. Якая тады радасць была вялікая! Бо і Ада Чачуга ў „Ніве" хваліла выканаўцаў, пісала пра цудоўныя ўборы, пра цудоўныя галасы...

Клопаты

Чарговым клопатам было арганізаванне аглядаў у час Вялікага посту. Я спытаў нашых, чаму так склалі той каляндарны расклад (бо Ваяводскі дом культуры не ладзіў мерапрыемстваў у час посту). А мне адказваюць, што „нас хваляць за ініцыятыву". Людзі прыязджалі, нават з бацюшкамі, і я ім тлумачыў, што песні прыстойныя, не распусныя, не грэх у посце заспяваць.

Яшчэ арганізаваў драмгурткі. У Сукавічах, Піражках, Нетупе, Новай Волі, Пяньках, Рыбалах, Паўлах, Скупаве, Навасадах, Арэшкаве, Вілінаве, Вульцы-Тэрахоўскай, Тымянцы, Чаромсе. І былі людзі, што ў гэтую справу сэрца ўкладалі: Вішанка, Крышань, Бура, Луба, Шурбак — гэта былі унікаты на вёсках, так яны многа рабілі; сёння такіх няма...

Выдалі нам зборнікі п'ес Купалы, Галубка. Але яны не для нас былі... Калісь Ольга Ліпінская гаварыла, што ў тэкст рэжысёр можа ўносіць змены, калі ўжо аўтара ў жывых няма. І я стаў уводзіць змены, напрыклад, у „Паўлінку" і „Мікітаў лапаць" увёў сучасныя песні, „Прымакі" перарабіў на вадэвіль: госці з Беларусі дзівавалися, калі такое пабачылі. А Мікола Гайдук сказаў: выкінуў дурніцу і атрымалася добрая п'еса.

У нашым асяроддзі была мода трымацца загадаў зверху. Быў час антыалкагольнай кампаніі і яна ўспрымалася некаторымі дзеячамі як загад. У Бельску моладзь паставіла Станіслаўскі вечар па Багдановічу. Была там сцэнка, дзе маладыя разліваюць у чаркі гарэлку. Успыхнуў тут скандал. Дык пазней замянілі тую „гарэлку" на чай. Зрабіў я мантаж па вершах Алеся Барскага са зборніка „Белавежскія матывы", паставіў у Мілейчычах, і зноў скандал, бо таксама з гарэлкай! Калектыў з Сакоў ставіў п'есу пра змаганне з самагоншчыкамі, дзе ў завяршэнне выкідаюць самагонку, але на стол стаўляюць манапалёўку; і зноў скандал, бо ж усё мае быць безалкагольнае. Калі ставіў „Паўлінку", то некаторыя фрагменты трэба было выкінуць. Сакрат Яновіч напісаў п'есу для калектыву з Паўлаў, пра махлярства; гэтая тэма ж і сёння актуальная была б. Выступілі Паўлы з гэтай п'есай, гледачы захапляюцца: як добра! А найбольш білі ў ладкі тыя, што ў першых радах сядзелі. Але прадстаўленне глядзела і працаўніца цэнзуры, а спектакль не прайшоў ранейшага дазволу. І тыя, што ў першых радах найбольш пляскалі, пазней хадзілі тлумачыцца...

Драмгурткі

Добрыя тэатральныя калектывы былі ў Беластоку. У Гайнаўцы да нас добра ставіліся. А на вёсках немагчыма было ставіць п'есы, бо там цяжка завучыць літаратурны тэкст. І я стаў ствараць фальклорныя калектывы. Пачалося з Меляшкоў, дзе паставілі „Каравайніц". Там Зіна Кахановіч была загадчыцай школы і яна пастаноўку распісала так, каб кожнай каравайніцы было што гаварыць. І так сталі выцягаць традыцыю. У Дабрывадзе паставілі „Несцерку" з традыцыйным вяселлем. У Арэшкаве — вечарыну „Пакудзелле". Раней у Арэшкаве спявала пяць ці шэсць жанчын. А тут на вечарыну з'явілася іх пад трыццаць! І давай тое пакудзелле вывучаць. Быў там музыка, зрабілі відовішча. А за гэтым зрухам пайшлі і конкурсы драмгурткоў, два: аўтэнтычна фальклорныя і апрацаванага...

Але каб калектыў працаваў, мусяць быць выступленні. І стаў я іх арганізаваць. Прывозіў іх што два тыдні ў Беласток. Калі меншыя калектывы, то па два выступалі, напр. Тыневічы з Курашавам ці Дашы з Чаромхай. Беластоцкія гледачы плацілі за білеты, госці атрымоўвалі камандзіровачныя. Было так як трэба, было гэта святам! Людзі бралі з сабою каўбасу, гарэлку. Бо ж пасля гэтай хвіліны радасці чакала іх зноў праца. І адбывалася гэта ў зімовы перыяд, ад выкапкаў да вясны, бо летам на вёсцы поўна работы. І Ваяводскі дом культуры вельмі прыхільна ставіўся да такіх мерапрыемстваў, бо ж яны і на яго долю былі.

Падлік

І за ўсю гэтую працу атрымаў я адзнаку „Заслужаны дзеяч культуры", іншых адзнак не меў. Але не для іх я працаваў, я працаваў для сваіх людзей. Адзін чалавек мне сказаў: які ранг гэтых адзнак, калі мы ведаем, хто іх атрымлівае. Аднойчы ў нашым клубе нейкая ўрачыстасць адбывалася, чыны з доўгімі тостамі выступаюць. А Міхась Хмялеўскі слухаў іх, слухаў, нарэшце ўстаў і кажа коратка: давайце вып'ем!

Працаваў я на ніве беларускай культуры з 1953 да 1981 года, калі з Беларускага грамадска-культурнага таварыства адышоў у дзетдом на педагагічную работу.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

http://litaratar.narod.ru

Мастацкае слова падобнае на нейкі магніт — калі яно зачапіла за душу, то да таго, хто яго прамовіў ці напісаў адразу ставішся з нейкай падсвядомай павагай. Калі ж паэтычнае ці празаічнае слова не знайшло нейкага адлюстравання ў тваім светапоглядзе, то на паэта ці пісьменніка глядзіш як на непрыязнага чалавека, якому па-просту няма чаго рабіць, вось ён і бавіць час графаманствам. Магчыма, такое меркаванне надта спрошчанае і аддае цынізмам, але ў спрэчцы хто літаратар,а хто графаман найбольш аб'ектыўным можа быць хіба толькі час.

Што ж рабіць тым, хто адчувае ў сябе літаратурнае натхненне і жадае падзяліцца сваімі поглядамі на навакольнае асяроддзе і ўласнае месца ў ім ужо цяпер, не чакаючы, калі валасы пабялеюць і жыццёвая мудрасць ахалодзіць эмоцыі і памкненні? Адказ адзін — гуртавацца і дзяліцца сваімі літаратурнымі знаходкамі з тымі, каму гэта цікава ўжо сёння. Гэта значыць, з падобнымі на цябе маладымі паэтамі і празаікамі.

Пэўна, менавіта з такіх меркаванняў ужо не першае стагоддзе з'яўляюцца рознага кшталту маладзёжныя літаратурныя гурткі і арганізацыі. Аб адной з такіх — творчай суполцы маладых літаратараў пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў, а дакладней аб іх віртуальным прадстаўніцтве пойдзе гаворка ў сённяшнім артыкуле.

Каб выйсці на сайт суполкі „Літаратар", трэба набраць на сваім камп'ютэры адрас **http://litaratar.narod.ru**.

Першая старонка сайта, як дарэчы і астатнія, выглядае даволі сціпла. Практычна ніякіх аздабленняў, усё падпарадкавана толькі аднаму — друкаванаму мастацкаму слову. Назва сайта, эмблема мінскага Дома літаратара і Пегас — гэта амаль усе відавочныя ўпрыгожанні сайта. На самой справе ўся прыгажосць месціцца ў творах маладых паэтаў і пісьменнікаў.

Цэлы сайт, як і мае быць, падзелены на рубрыкі, якія пазначаны больш чым сціпла. Адразу знайсці, дзе яны знаходзяцца не вельмі лёгка. Але гэта не з'явіцца перашкодай для тых, хто прагне пазнаёміцца з творчасцю маладых беларускіх літаратараў.

Першая рубрыка „Надзённае" ўяўляе свайго роду навінныя паведамленні. Праўда, абнаўляюцца яны не надта часта, калі аб 2003 годзе ідзе гаворка ў будучым часе. Па ўсім відаць, што даная старонка аказалася закінутай распрацоўшчыкамі. Сканцэнтраваліся яны на размяшчэнні вершаў і аповесцей, якія месцяцца пад адпаведнымі рубрыкамі „Проза", „Паэзія", а таксама „Гумар".

Даведацца пра творчасць таго ці іншага сябра суполкі дазваляе старонка „Змест", дзе з кожнага прозвішча маецца гіперспасылка на вершы ці апавяданні літаратараў. Дарэчы, прозвішчаў даволі многа. Праўда, гэта не значыць, што ўсе творы маладых аматараў пяра і чарніла вартыя чытання. Але, праўдападобна, кожны віртуальны наведвальнік знойдзе там мастацкае слова, на якое ў душы нешта з удзячнасцю адгукнецца. А адгукнуцца мусіць, бо як заўважае ў сваім слове да літаратараў кіраўнік суполкі Алесь Масарэнка, „менавіта да тых удзельнікаў нашай сябрыны, хто працуе ўдумліва, любіць роднае слова і сваю Бацькаўшчыну, і прыйдзе заслужанае прызнанне — іх творы знойдуць свайго чытача. Раман... Аповесць... Зборнік апавяданняў... Паэма... Нізка вершаў... Адным словам, усё залежыць ад таленту: калі ён ёсць — будуць і творы. Тыя самыя, высокамастацкія, што звычайна і складаюць першую кнігу".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Аўстралійскі акцэнт студзеня

Імкліва прамінуў першы месяц года. Застаецца падсумаваць яго спартовыя вынікі і вызначыць лепшых беларусаў паводле дасягненняў на розных стадыёнах, арэнах і пляцоўках.

1. Максім Мірны (тэніс). Паспяхова выступілі айчынныя тэнісісты на першым турніры „Вялікага шлема" — адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі. Найбольшага дасягнуў наш лідэр, які двойчы выйшаў у фінал у дзвюх намінацыях — міксце (разам з Вікторыяй Азаранкай) і мужчынскім парным разрадзе (са сталым партнёрам шведам Юнасам Б'ёркманам). У абодвух фіналах Мірны з калегамі прайгралі, але пасля турніру Максім узначаліў рэйтынг лепшых парных тэнісістаў свету. Гэтую пазіцыю аднойчы ў сваёй кар'еры ён ужо займаў.

2. Андрэй Гардзееў (марафон). За апошнія тры месяцы наш стаер тройчы паспяхова выступіў у вельмі прэстыжных забегах. У студзені было трэцяе месца ў амерыканскім Феніксе, што з задавальненнем і ацэньваем. Дадам, што марафонец Гардзееў першым з беларускіх лёгкаатлетаў выканаў алімпійскі нарматыў і зарэзерваваў білет у Пекін.

3. Уладзімір Самсонаў (настольны тэніс) настолькі прывучыў да сваіх дасягненняў, што кожны чарговы поспех успрымаецца як непазбежная заканамернасць. У мінулым месяцы Уладзімір стаў сярэбраным прызёрам адкрытага першынства Харватыі.

4. Сяргей Давыдаў (фігурнае коўзанне) упершыню ў сваёй кар'еры быў так блізка да п'едэстала на топ-турніры. У выніку ж — 4 месца на чэмпіянаце Еўропы (ён праходзіў у Польшчы) па адным з самых эстэтычных і тэхнічна складаных відах спорту.

5. Антон Кушнір (фрыстайл) першы раз у сваёй біяграфіі трапіў на п'едэстал этапа Кубка свету, пра што расказвалася раней. Як вынік — намінаванне ў нашым гіт-парадзе.

Жанчыны

1. Вікторыя Азаранка (тэніс). Упершыню ў гісторыі адразу дзве беларускія тэнісісткі выйшлі ў трэці круг (у лік 32 мацнейшых) на Australian Open. Пасля чаго іх рэйтынг імкліва пайшоў угору — Вікторыя ўжо 73-я, а Анастасія Якімава ажно 53-я. Найперш адзначаем Азаранку, якая вызначылася, як згадвалася вышэй, і ў пары.

2. Наталля Сакалова (біятлон) — адзіны пакуль промень святла ў змрочным царстве айчыннай стралкова-лыжнай брыгады. Бронза этапу Кубка свету ў славенскім горадзе Паклюка ў пераследзе на 10 км, да якой Наталля падбіралася спакваля, таму пацвярджэннем.

3. Ала Цупер (фрыстайл). За плячыма дасведчанай лыжнай акрабаткі багата палётаў і трафеяў. У студзені асабістая скарбонка папоўнілася яшчэ адным бронзавым медалём Кубка свету.

4. Вераніка Паўловіч (настольны тэніс) у Харватыі разам з расіянкай Аксанай Фадзеевай здабыла срэбра ў пары. Шкада, што на аналагічным чэмпіянаце Славеніі ў прызёры беларусы не выбіліся (заўважым, што Самсонаў прапускаў турнір).

5. Васіліса Марзалюк (вольная барацьба) заняла 2-е месца на міжнародным турніры Гран-пры ў расійскім Краснаярску. Варта пахваліць і Вольгу Хінко, у якой трэцяе месца на гэтых спаборніцтвах.

Камандай месяца назавем хакейны клуб **„Юнацтва"**, які заваяваў Кантынентальны кубак. Пра гэта падрабязна расказвалася на старонках „Нівы". А трэнерам студзеня варта прызнаць славутага **Спартака Мірановіча**, які вывеў зборную Беларусі па гандболе ў накаўт-раўнд за выхад у фінальную частку чэмпіянату Еўропы, дзе нашы сустрэнуцца ў чэрвені са швейцарцамі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Працавітае жыццё

Бабцы Любе Плашкевіч з Трасцянкі ў гэтым годзе споўніцца 93 гады. Нарадзілася яна ў сям'і Марыі і Міхала Внушынскіх, якія са сваімі трыма дзеткамі цягнуліся ў далёкую Расію ў памятным 1915 годзе. Толькі падарожжа таго і самога жыцця ў Расіі бабка Люба не помніць. Добра толькі запамяталася ёй, што вярнуліся летам і што ўсё была галодная. Яе маці хадзіла жабраваць, каб хоць чым накарміць сваіх дзетак. Елі лупіны ад бульбы, збіралі змерзлыя бульбачкі на полі... А ўжо кулеш з брукваю, то быў прысмак!

Польскія ўлады ўвялі абавязак навукі — то малая Люба хадзіла ў школу да 13 год. За той час закончыла 4 класы. З малых гадоў памагала таксама бацькам ва ўсіх палявых работах. Тады ўсе тыя працы выконваліся без дапамогі машын, так што работы нават і на невялікай гаспадарцы было шмат усёй сям'і.

Люба расла на прыгажуню, нічога дзіўнага, што першы раз выйшла замуж у 18 год. Муж аказаўся непаседай, не хацеў рабіць на гаспадарцы і хутка жыццё разладзілася. Мама забрала яе дахаты пасля паўгода.

Другі раз Люба выйшла замуж за намнога старэйшага за сябе мужчыну — Івана Плашкевіча. Перад вайной, у 1937 годзе, нарадзілася ў іх дачка Вера, а пасля вайны — сын Валодзя. Жылі, абраблялі сваю невялікую гаспадарку, гадавалі дзетак. Калі ў пяцідзесятыя гады паўстала ў Трасцянцы Грамадская рада, Іван пайшоў працаваць сторажам, а бабка Люба — прыбіраць. І так цягнулі яны два штаты. Калі пры Герку паліквідавалі Грамадскія рады — стары ўжо муж Любы атрымаў (за працу стоража і качагара) невялікую пенсію, а потым і бабка Люба. Толькі нядоўга ёю карыстаўся, бо памёр у 1977 годзе, маючы 77 год.

Гаспадарку пераняў сын і цяпер на ёй гаспадарыць. Люба памагала, а на старасць перайшла жыць да дачкі.

У бабулькі Любы дзве ўнучкі і двух унукаў. Сярод іх настаўніца Божага закону ў адной з беластоцкіх школ — Лена Добаш (глядзі „Зорку" ад 28 студзеня г.г.). А праўнукі — Леніны сыночкі робяць ужо прабабцы фатаграфіі.

На выгляд Люба яшчэ здаровая, гэта ад таго, што ў яе заўсёды румяныя шчокі. Але скардзіцца на здароўе, бо не так даўно паламала руку, потым упала і набіла вельмі моцна другую. Цяпер ад таго дранцвеюць рукі, здараюцца сутаргі, што нават бульбу цяжка пачысціць. Вось на гэта скардзіцца жанчына, якая ўсё жыццё прывыкла працаваць, памагаць. А яшчэ нядаўна ўвесь агарод дачцэ Веры палола. Цяжка такім людзям, прывыклым за доўгія гады нешта рабіць, сядзець без работы!

Рута

Майстар па пляценні кошыкаў

У асенне-зімовы перыяд на вёсцы работы быццам менш. Аднак заўсёды можна сабе знайсці занятак, каб хутчэй і з карысцю каратаць доўгія вечары. Прыкладаў на гэта можна знайсці многа.

Вось у Рыбаках пляценнем рознага ўзору кошыкаў здаўна займаецца **Юрка Барвінскі**. Выконвае ён іх вельмі дакладна, падбіраючы якасны матэрыял на каблучкі і іншыя элементы кошыка, да таго ў адпаведным колеры. Юрка Барвінскі пляце лазовыя кошыкі на заказ і на продаж. У яго можна заказаць кошыкі для бульбы, грыбоў, ягад.

Юрка Барвінскі

Ягонымі вырабамі карыстаюцца шматлікія гаспадыні ў Рыбаках і наваколлі.

— Спляценне кошыка гэта вельмі дакладная і працаёмкая работа, — кажа майстар.

Юрка Барвінскі аказвае таксама транспартныя паслугі. На возе запрэжаным у кабылку, або на санях, калі снегу пад дастаткам, пракатвае ён турыстаў па наваколлі. Юрка Барвінскі любіць коней і ведае, што каб ягоная кабылка высока насіла галаву, трэба падсыпваць ёй аўса, даглядаць жывёліну.

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

Найлепшыя скульптары

Падчас зімніх канікул — 25 студзеня г.г. — у святліцы ў Старым Ляўкове (Нараўчанская гміна) адбыўся II гмінны скульптурны конкурс. Матэрыялам, з якога выконваліся скульптуры, была спецыяльна падрыхтаваная гліна. У конкурсе ўдзельнічала 35 асоб у розным узросце. Чаго толькі скульптары-аматары не прыдумалі! Былі постаці людзей, звяркі, вужакі ды вычурныя д'яблікі. Працы ацэньвала журы ў складзе: Ядвіга Карпюк, Ян Целушэцкі і Аліна Барташук.

І так, у катэгорыі — 0-III класы пачатковай школы першае месца заняла Эмануэла Мірановіч, другое — Ружа Нічыпарук, трэцяе — Патрыцыя Бірыцкая. Вылучэнні атрымалі Якуб Кардаш, Ядвіга Нічыпарук, Вераніка Максімюк ды Матэвуш Лясота.

Сярод удзельнікаў IV-VI класаў найлепш сябе зарэкамендавалі Каміла Кумэта, Клаўдзія Лясота і Малгажата Іванюк. Вылучэнні ў гэтай узроставай групе журы прысвоіла Мартыне Стульгіс, Матэвушу Казакевічу і Магдаліне Харкевіч.

У катэгорыі гімназістаў першынство заваявала Кінга Кардаш, другое месца ўзяла Анна Верамюк, трэцяе — Барбара Ігнацюк. Вылучэнні атрымалі Анеля Паскробка, Клаўдзія Расінская і Магдаліна Кумэта.

У катэгорыі ліцэістаў першае месца заняла Магдаліна Супрун, другое — Дарыюш Валадкевіч.

У групе дарослых асоб журы прызнала ўзнагароду Вітальду Макацу (першае месца), Кацярыне Рэент (другое месца) ды сужонству Анне Залескай-Нічыпарук і Міраславу Нічыпаруку (трэцяе месца).

Усе ўдзельнікі былі задаволеныя перш-наперш з рэчавых узнагарод і з дыпломаў, пра якія паклапаціліся дырэктарка Гміннага асяродка культуры ў Нараўцы Анна Стульгіс і інспектар пластыкі таго ж ГАК Кацярына Бяляўская. У падрыхтоўцы і ў час конкурсу найбольш папрацавалі Вольга Максімюк, вопытная інструктарка пластыкі з Новага Ляўкова ды Галена Рэент, кіраўнічка стараляўкоўскай святліцы.

(мох)

У шпіталі

Новы год па новым стылі сустракаў я ў хаце, але другі, па старым стылі прыйшлося мне сустракаць у гарадскім шпіталі па вул. Сянкевіча ў Беластоку. Папаў я ў шпіталь па хваробе і праляжаў там 10 дзён. Так склалася, што ў палаце было нас пяць чалавек і ўсе праваслаўныя. Усю ноч з 13 на 14 студзеня слухалі мы Радыё Беласток, якое перадавала навагоднія пажаданні. Цераз акно мы бачылі, як з балкона на 10 паверсе суседняга блёка ў неба выстралілі феерверкі. Для нас, зняможаных хваробамі, была гэта цудоўная ноч.

* * *

У коле кампаньёнаў па палаце (як мы сябе назвалі) абмяркоўвалі мы шмат розных спраў. Задумоўваліся мы, ці сапраўды ў нас, у Польшчы, такая бяда-гора, што адных корміць „Карытас", а другіх — „Элеос". І чаму некаторым грошы даюцца дарма? Напрыклад, у ходзе тэлетурніру „Угадай мелодыю" кожны дзень нехта выйграває 10 тысяч злотых. Адкуль бяруцца гэтыя грошы? Не абман гэта які, ці мо спонсар трапіўся багаты, што такія грошы кідае на вецер? А падобных тэлетурніраў у нас шмат!

А мы жабруем грошы на бяздомных, шпіталі з-за недастатковага фінансавання пападаюць у даўгі. Чытаў я ў газеце „Факт", што з прычыны задоўжанасці судовыя выканаўцы могуць закрыць нават 200 шпіталяў.

У тэлебачанні безупынна ідзе рэклама, усюды спонсары, а нам, пенсіянерам, трэба „цешыцца" калі дабавяць 5 злотых у месяц і 330 злотых адзін раз у год. Цяперашняя ўлада хваліцца, што ў Польшчы — рай. Па-мойму: каму рай, а каму пекла.

Дзядзька ЗАХАР

Мы самі сябе губім

Пры нямецкай акупацыі Дубічы наведаў нямецкі камісар, склікаў сход і сказаў на чыста польскай мове: гэта не мы, немцы, вас губім, толькі вы самі сябе губіце. Тыя словы адносіліся не толькі да адных дубічлян, але і да рэшты акупаванай тэрыторыі. А абазначала гэта, што розныя даносчыкі і правакатары ў кожнай нацыі прыносяць смерць і знішчэнне. І сярод нас былі і ёсць такія людзі, сёння толькі яны не так небяспечныя як пад акупацыяй.

У Дубічах у міжваенны час жыў дзяк родам з Расіі, які пры кілішку хваліўся, як шабляй рубаў бальшавікоў у час рэвалюцыі. Некаторыя нашы людзі гэта запамяталі і калі восенню 1939 года завіталі да нас вызваліцелі, дык той дзяк, як чалавек адукаваны, пачаў працаваць у нашым кааператыве (краме). Аднаму ён не ўгадзіў і той, хаця неадукаваны, знайшоў такога пісара, які напісаў на дзяка данос у НКУС, дадаўшы некалькі подпісаў аднавяскоўцаў. Дзяк апынуўся на Салаўках, адтуль прыслаў некалькі пісем да жонкі (яе нейкім цудам не забралі), дзе захапляўся „северным сиянием", бо толькі гэтым мог. На шчасце больш даносаў у нас не было, бо пад нямецкай акупацыяй даносчыкі баяліся помсты „гасцей" з лесу.

Кожны данос, які б ён ні быў: вусны, пісьмовы, аддача чужых лістоў сваім любімцам каб скампраметаваць іх аўтара — гэта ніякі подзвіг, але апошняе свінства і здрада, гэта горш сабачай натуры. І адрачэнне ад роднага, гэта таксама здрада, якою самі сябе губім.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Дыялог патрэбен

У сувязі з публікацыяй у штотыднёвіку „Ніва" артыкула рэдактара Мацея Халадоўскага „Указанні пані міністр" ад 31 снежня 2006 года накіроўваю матэрыял з пазіцыяй Пасольства адносна беларуска-польскага дыялогу. Звяртаюся з ласкавай просьбай надрукаваць яго ў штотыднёвіку.

З павагай,

***Дзмітрый Выбарны**, прэс-сакратар Пасольства Беларусі ў Польшчы*

* * *

Чаму з такой мэтанакіраванасцю незалежныя польскія аўтары заўзята адстойваюць тэзіс аб тым, што сустрэчы афіцыйных асоб Беларусі і Польшчы з'яўляюцца „пажывай" (ну і слова!) для „рэжымнай прапаганды"?

Адкажу коратка. А чытачы няхай судзяць. У 2003-2004 гг. адбыліся сустрэчы практычна ўсіх вышэйшых і высокіх афіцыйных асоб Беларусі і Польшчы. Ці аб гэтым было чуць? Ці была прапаганда?

А ў выніку гэтых сустрэч удалося вырашыць шмат спраў і праблем. Прывяду толькі некаторыя прыклады:

1. Адкрыты міжнародныя пагранічныя пераходы „Рудаўка — Лясная" і „Пярэраў — Белавежа" (у 2005 годзе);

2. Заключана пагадненне аб рэканструкцыі Аўгустоўскага канала (у 2005 годзе);

3. Узгоднена і падпісана пагадненне аб узаемных паездках грамадзян Беларусі і Польшчы ў час візавых адносін з паніжэннем у 2 разы візавых аплат да 5 долараў ЗША за аднакратную візу (прыгадаем: не Беларусь была ініцыятарам візавых адносін);

4. У 2003-2005 гг. заключаны і пачалі дзейнічаць 22 міжурадавыя і міжведамасныя пагадненні, у тым ліку аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве;

5. У 2003 годзе адкрыта трэцяя консульская ўстанова Беларусі ў Польшчы — Консульства ў Бялай-Падлясцы;

6. Адкрыты ў Мінску помнік Адаму Міцкевічу;

7. Нарэшце апошняе, але не астатняе — за 2003-2005 гг. тавараабарот паміж Беларуссю і Польшчай вырас у 3 (!) разы.

Ці можна было дасягнуць вышэйпаданых, думаю, добрых для беларусаў і палякаў дамоўленасцей на ўзроўні дырэктараў дэпартаментаў? Адказам з'яўляецца адсутнасць такіх прыкладаў у другой палове 2005 і 2006 гг.

Ці трэба далей адчыняць пагранпераходы, каб паскорыць памежныя працэдуры, ці трэба ўводзіць сумесны кантроль на беларуска-польскай мяжы, ці трэба далей ствараць лепшыя ўмовы для гандлю, ці трэба пашыраць энергадыялог і г.д.? Давайце ж не будзем гаварыць аб „прапагандзе", але думаць аб справах, якія турбуюць беларусаў і палякаў, і шукаць за сталом перамоў іх вырашэння.

А на прыёмы беларускія дыпламаты ў Польшчы запрашаюць усіх сяброў у гэтай суседняй краіне. Падаецца, што чым менш мы размаўляем, тым больш узнікае праблем у адносінах — і наадварот, чым больш гаворым адзін з адным, тым больш спраў пазітыўна вырашаем.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2007 r. upływa 5 marca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Наклад: 1 884 egz.

Суседскія былі

НАВАГОДНІЯ ПАДАРУНКІ

Першы раз у жыцці, шпарка перастаўляючы маленькія ножкі, Ігарок шыбаваў хутчэй чым яго матуля. Ён нават спрабаваў цягнуць яе за руку, ірваўся наперад як шчаня, якому ўпершыню пачапілі на шыю вяроўку, а яно ўбачыла ката. Маці толькі ўсміхалася і тлумачыла шасцігадоваму сынку, што спяшацца няма куды. Яшчэ рана. Адкрыццё святочнай ёлкі для дашкольнікаў распачнецца толькі праз гадзіну. А Дзед Мароз прыйдзе яшчэ пазней. Ды Ігарок нічога не хацеў слухаць. Яго жвавыя вочкі былі шырока раскрытыя і, здавалася, зусім не маргалі. Ручкі аж трэсліся ад нецярпення, як асінавыя лісточкі на пачатку восені. Яшчэ мінулым годам ён убачыў, як Дзед Мароз нейкаму хлопчыку падарыў машынку. Чырвоную, з мігаючымі фарамі. Дакладна такую, як Ігарок мроіў набыць. І вось ізноў Новы год. Зноўку Дзед Мароз будзе раздаваць падарункі. Ігарок цэлы год вучыў на памяць вершык, які тады расказваў ля ёлачкі той хлопчык. І марыў атрымаць машынку. І не можа быць інакш! Бо і ліст пісаў таму чарадзейнаму дзеду, і ялінцы ў хаце нашэптваў пра сваё жаданне. Толькі бы паспець. А то можа хто першы парупіцца расказаць той вершык, і тады ўсё прапала. Дзе тады ўзяць такую машынку, якая ёсць толькі ў Дзеда Мароза?

Акурат у гэты час, у непрыбранай кватэры на другім баку вуліцы ледзьве жывы Віктар Ляховіч з жахам узіраўся ў люстэрка на выяву твару пакутніка і стараўся адгадаць, хто гэта можа быць. Ён, накруціўшы на галаву мокрую анучу, каб хоць неяк зменшыць галаўны боль ад непамерна шмат учора выпітага, стараўся, дрыжачымі як у неўротыка рукамі прыстасаваць на і так непаголены твар дзедамарозаўскую бараду. Бо сёння ў яго ёлка для дашкольнікаў. А ўчора... Хай яно згарыць, тое ўчора! Хай яго завернуць камяні! Трэба ж было так уляпацца. Сам вінаваты. Ведаў жа што так будзе. Падпісаўся ў ролі Дзеда Мароза разносіць падарункі па заказах. А ў кожнай хаце налівалі. Без келіха не адпускалі. Невядома, нават, ці ўсе заказы выканаў. Ці ўсе кватэры, якія мусіў наведаць, абышоў. Хто гэта сёння памятае? Ды гэта не самае горшае. Ёсць і яшчэ больш жахлівы ўспамін.

У Віктара ажно валасы сталі дыбам, як у шалёнага сабакі ў перыяд спарвання. У вачох, як прывіды з труны, сталі паўставаць учарашнія гісторыі. Снягурачка так была налізалася, што на нагах не стаяла. Так і даплялася, абняўшы Віктара за шыю, аж да яго хаты. А ён, па-п'янаму, каб яго трасца ўзяла, нават не падумаў, што яго жонка можа неадэкватна ўспрыняць аж настолькі ўнучкавыя адносіны Снягуркі да Дзеда Мароза. І, ляпнуўшы па закаханым мужавым сэрцы дзвярамі, пайсці з дзецьмі сустракаць прыход Новага года аж у лагер самага ваяўнічага ворага. Да цешчы.

Ды і гэта можна перанесці. Неяк наладзіцца само па сабе. Усё можна сцярпець. Немажліва вытрымаць толькі той невыносны боль, які разрываў галаву на дзве роўныя часткі і праблемы з неданесенымі падарункамі і прапаўшай жонкай адсоўваў на другое месца. А пачуццё абавязку прымушала яшчэ ісці на ёлку. Там можа, дзеці даўно гарланяць: „Дзед Мароз, Дзед Мароз!" А Дзед Мароз усё ніяк не можа прымайстраваць да свайго зморшчанага твару кудлатую, белую бараду.

Нарэшце атрымалася. Віктар накінуў чырвоную шубу, пачапіў такога ж колеру шапку, узяў у рукі кій, які быў зараз вельмі дарэчы і, абапіраючыся на яго, пацягнуў за сабой па мокрым снезе мяшок з падарункамі ў гарадскі дом культуры.

Дзеці з нецярпеннем яго ўжо чакалі. „Дзед Мароз!" — запішчалі яны. А ў таго дзеда ад крыку галава пачала трашчаць як спелы гарбуз, на які ўселася абшарным азадкам стодвацца-цікілаграмовая прадаўшчыца.

— Дзеці! Дзеці! — пачалі самі маліць ягоныя губы. — Не крычыце, дзеці. Каб вы толькі зналі, як мне хрэнова. Як мне хрэнова!

Добра, што ў Віктара сілаў не было зусім. Таму яго просьба прагучала так ціха, што шчаслівыя дзеткі не пачулі апошняга выдыху адчаю таго чарадзея з падарункамі. І не даведаліся, што Дзед Мароз выслаўляецца дакладна так, як і іх таты пасля кожнага вясёлага свята. Яны далей працягвалі весела скакаць вакол расхрыстанай постаці, якая, павесіўшыся на кій, нерухома тарчала ў цэнтры залы. А Ігарок, выбраўшы зручны момант, калі ўсе ўжо пачалі стамляцца, падляцеў да Дзеда Мароза і стаў спешна расказваць завучаны вершык.

Дзед шырока, як спалоханы філін, раскрыў вочы і пачаў напружваць мазгі, каб уцяміць, што тут адбываецца. Пасля, яшчэ трымаючыся рукамі за кій, рухнуў на калені перад Ігарком, і прашаптаў:

— Хлопчык, каб ты ведаў, як мне хрэнова!

З боку гэта выглядала так, што нібыта чалавек у чырвонай шубе ўбачыў перад сабой святога. І моліць таго, каб уратаваў грэшную душу на страшным судзе. І ніяк не выглядала на тое, што можа нешта падарыць таму святому.

Хлопчык з жахам паглядзеў на спакутаваны твар паўночнага чарадзея. На вочы навярнуліся буйныя слёзы. Няўжо ён не атрымае машынку?! І вершык расказваў з інтанацыяй, як мама вучыла, і рукамі махаў. А Дзед Мароз кажа нешта пра „хрэнова". Як жа так!

— Ага! — раптам успомніў пра свае абавязкі белабароды. — А вось табе і падарунак!

Ён палез у торбу, доўга капаўся і нарэшце дастаў адтуль... машынку! Чырвоную, з бліскучымі фарамі. Яшчэ большую і яшчэ лепшую, чым мінулым годам падарылі нейкаму незнаёмаму хлопчыку. Ігарок аж запішчаў ад радасці. А стары дзядуля паглядаў на падарунак і думаў, каму гэта ён учора мусіў тую машынку занесці, бо на гэтую ёлку адміністрацыя гарадскога дома культуры такіх дарагіх падарункаў не набывала.

А Ігарок ужо нёсся з усіх ног дахаты. У яго галаве была толькі адна думка. Як дапамагчы гэтаму чарадзею, які падарыў такую прыгожую машынку, а сам застаўся стаяць ля навагодняй ёлкі такі няшчасны і адзінокі. І што самае важнае, Ігарок нават ведаў як дапамагчы.

— Тата, тата! — закрычаў ён, яшчэ не пераступіўшы парога. — Дзеду Марозу хрэнова. Трэба дапамагчы. Ён такі добры! Машынку мне даў.

А яшчэ праз некалькі хвілінаў хлопчык зноў быў у доме культуры.

— Дзед Мароз, — звярнуўся ён да ўсё той жа спакутаванай постаці. — Дзякуй за машынку. А гэта табе. Ад мяне і майго таты падарунак. Як таму бывае хрэнова, ён гэта заўсёды купляе. Я думаю і вам дапаможа.

І ён, кволенькімі ручкамі, ледзьве спраўляючыся, каб не выпусціць з рук, падаў Дзеду Марозу свой няхітры падарунак ад усяго дзіцячага сэрца. Бліскучую бутэлечку халоднага светлага піва.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

Шыфраграма

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне: прыказку.

1. вялікая азіяцкая рака з прытокамі Сунгары і Усуры = 7 _ 3 _ 2 _ 18 _;
2. перапончатакрылае насякомае з джалам = 27 _ 15 _ 9 _;
3. пара года з галалёдам = 21 _ 13 _ 12 _ 14 _;
4. напр. Чынгіз Айтматаў = 4 _ 5 _ 10 _ 8 _ 29 _ 6 _;
5. дзяржаўная або грамадская сістэма, уклад жыцця = 24 _ 11 _ 1 _;
6. халодная зброя, падобная на шаблю, вострая з абодвух бакоў = 16 _ 17 _ 26 _;
7. частка камп'ютэра, якую характарызуюць мегабайты, гігабайты, а неўзабаве і тэрабайты = 23 _ 22 _ 28 _ 25 _ 19 _ 20 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 53 нумара

Адзін, рабін, вадалаз, Буш, Воранава, час, іл, выжал, екценне, Шырак, хваіна, агарод, цыбуля, каравай.

Рашэнне: **Здаровы жабрак шчаслівейшы за хворага караля.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

11.02 – 17.02

Баран (22.03. — 20.04.) Могуць заляцець табе ў галаву геніяльныя ідэі і зможаш выкараскацца з любой кабалы. Можаш увесці ў сваё жыццё пару канструктыўных змен. Будуць цябе ўсе слухаць.

Бык (21.04. — 21.05.) Да 13.02. аформіш пару вельмі важных для цябе спраў (мусіш быць рашучы). Некаторыя здарэнні выведуць цябе з раўнавагі. Удадуцца аперацыі і працэдуры.

Блізняты (22.05. — 21.06.) Некаторыя планы могуць не здзейсніцца. Шмат сумненняў. Мусіш справіцца з „хвастамі" і аварыямі. Гэта лёс можа быць тваім кавалём, а кавадлам — ты.

Рак (22.06. — 23.07.) Многа энергіі; аж здзівішся, што зможаш справіцца са справамі, з якімі раней ты не даваў сабе рады. Можаш перамагчы шкодную звычку, асабліва 17.02. (можаш кінуць курэнне, алкаголь, сесці на дыету).

Леў (24.07. — 23.08.) Да 12.02. цяжка ўзяць сябе ў рукі, затое з 15.02. многа энергіі; зможаш за пару дзён зрабіць столькі, колькі за некалькі тыдняў (аж да 19.02)! Ды на вялікія грошы не разлічвай...

Дзева (24.08. — 23.09.) Старайся не выдаваць таго, чаго яшчэ не зарабіў (хоць месяц закончыш на плюсе). Цяжка справіцца з тэрмінамі; можаш спадзявацца неспадзевак; будзь эластычным.

Шалі (24.09. — 23.10.) Вельмі рамантычныя прыгоды. У „валянцінкі" чакаюць цябе проста незямныя ўражанні! Магчымасць няблага падзарабіць. Можаш пасварыцца з сябрамі, якім не пашкадуеш нямілых слоў.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Зробіш на іншых вялікае ўражанне. Смела выкарыстоўвай свае тузы, а ўсё ўдасца. Цярпліва чакай шчодрых жэстаў фартуны.

Стралец (23.11. — 22.12.) Да 12.02. моцная схільнасць да кулінарых грашкоў (гэта не паўплывае на красу і добры настрой). Важныя прафесійныя рухі. Нялёгка змяніць на „новую мадэль" старую пару.

Казярог (23.12. — 20.01.) Можаш няблага зарабіць на сваім улюбёным занятку. Новыя, шматабяцальныя знаёмствы (можа пасля выкарыстаеш гэтыя кантакты ў інтарэсах). Могуць паявіцца нагоды, на якія ты перастаў ужо разлічваць.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Можа акружаць цябе вяночак аматараў, ды нікому, здаецца, не намовішся на трывалую сувязь. Старанліва выконвай загады шэфа. Грошы ліпнуць да цябе! Ды турбуе цябе ўнутраная шарпаніна (аж да 26.02.!).

Рыбы (20.02. — 21.03.) Кружыць каля цябе таямнічая закаханая асоба (яна хутка можа здабыць тваё сэрца). Вялікай кар'еры не чакай, хоць на грошы разлічвай. Настрой яшчэ ненайлепшы, стома. Перашкоды для твае амбітнасці, ды не адмаўляйся ад планаў.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960